Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ВЕРАСНЯ 2016 г. СЕРАДА № 187 (28297)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Спартыўнае і асабістае Марыны Літвінчук

СТАР. 5



Чым здзіўляе цырк?

СТАР. 6



Рагачоўскімі вуліцамі з мовазнаўцам

СТАР. 8

## ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ АДНОСІН

Сёння пачынаецца дзяржаўны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Кітайскую Народную Рэспубліку. Падчас візіту запланаваны сустрэчы з найвышэйшым кіраўніцтвам Кітая. Па выніках чакаецца падпісанне каля трыццаці міжнародных дакументаў аб развіцці супрацоўніцтва ў палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай сферах.

Нашы краіны рэгулярна абменьваюцца візітамі на найвышэйшым і высокім узроўнях, ажыццяўляецца актыўны міжпарламенцкі дыялог, дынамічна развіваюцца міжведамасныя беларуска-кітайскія кантакты. Высокі ўзровень беларуска-кітайскіх палітычных адносін служыць надзейнай асновай для развіцця двухбаковых гандлёвых сувязяў. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведваў Кітай у студзені 1995, красавіку 1997, красавіку 2001, снежні 2005, жніўні 2008, кастрычніку 2010, ліпені 2013 і верасні 2015 гадоў. Візіты спрыялі развіццю гандлёвых адносін і прыцягненню замежных інвестыцый у беларускую эканоміку.




## УКАЗ АБ СУМЕСНЫХ ПРАЕКТАХ

Указам № 349 «Аб рэалізацыі інвестыцыйных праектаў», які падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, удакладнены парадак рэалізацыі некаторых інвестыцыйных праектаў з Кітаем. Указ накіраваны на забеспячэнне паспяховай рэалізацыі сумесных беларуска-кітайскіх інвестыцыйных праектаў у сферы электраэнергетыкі, аўтамабілебудавання, а таксама цэлюлозна-папяровай і тэкстыльнай галінах.

Дакумент удакладняе парадак рэалізацыі асобных праектаў, вызначае пералік замежных арганізацый, якія маюць права на прыцягненне да працоўнай дзейнасці ў Беларусі па працоўных дагаворах замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць у Беларусі, на перыяд рэалізацыі гэтых інвестыцыйных праектаў.

**Да ведама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

Дзясятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю работу 3 кастрычніка 2016 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 3 кастрычніка 2016 года з 9.15 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

# Утаймавальнік ільвоў



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Магілёўскі скульптар Андрэй Вараб'ёў (на фота) стварыў чатыры вялікія скульптуры львоў, якія будуць упрыгожваць Пушкінскі мост абласнога цэнтра. У бронзавых драпежнікаў ёсць жывы прататып — леў-альбінос Джон з цыркавога атракцыёна братоў Запашных. У мінскім цэху прадпрыемства «Скульптурны камбінат» Беларускага саюза мастакоў адлітым з бронзы статуям зараз наводзяць апошні «марафет». Паводле слоў мастака, праца над праектам працягвалася амаль год. Гэтымі днямі львы пакінуць мінскую майстэрню і паедуць у Магілёў.

***Фотарэпартаж пра падрыхтоўку скульптур глядзіце на сайце «Звязды».***

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Сяргей КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь:**

*«Цяперашні ўзровень стаўкі рэфінансавання ўяўляецца даволі адэкватным бягучай і прагназуемай да канца года сітуацыі. Нацыянальны банк пастаянна праводзіць нарады наконт магчымасці змянення стаўкі рэфінансавання. Пры гэтым пад увагу прымаецца шырокі пералік фактараў — і сітуацыя ў розных сегментах фінансавага рынку, і плацежны баланс. Сітуацыя ў гэтым годзе дала нам магчымасць правесці ўжо зніжэнне стаўкі рэфінансавання больш істотнымі тэмпамі, чым гэта прагназавалася».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9281 | ▼ |
| Еўра | 2,1683 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0302 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0747 | ■ |

■ Чалавек і асяроддзе

## ПРАВІЛЬНЫ НАПРАМАК — ЗЯЛЁНЫ

### І Ў НАШАЙ КРАІНЕ ГЭТА ДОБРА РАЗУМЕЮЦЬ



Фота БЕЛТА.

**Зялёная эканоміка — кірунак у эканамічнай навуцы, які сфарміраваўся ў апошнія два дзесяцігоддзі. У яго рамках лічыцца, што эканоміка з'яўляецца залежным кампанентам прыроднага асяроддзя, у межах якога яна існуе і з'яўляецца яго часткай. Іншымі словамі, чалавецтва нарэшце перастала называць сябе абсалютным гаспадаром прыроды, што, не чакаючы ласкі, павінен быў узяць патрэбнае самастойна. Асяроддзе навокал ёсць тое, што мы робім — як у малым, так і ў вялікім...**

**Якія змены чакаюць беларусаў у сувязі з пераходам на прынцыпы зялёнай эканомікі? На гэтую тэму ішла гаворка падчас анлайн-канферэнцыі ў БЕЛТА. На пытанні адказвала першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ія МАЛКІНА. Прапануем чытачам найбольш цікавыя моманты гутаркі са скарачэннямі.**

### Сітуацыя вакол БелАЭС пад кантролем

***— Якія дадатковыя меры па кантролі радыяцыйнай абстаноўкі прымаюцца з улікам будаўніцтва АЭС?***

— У зоне назірання Беларускай АЭС (радыус 12,9 кіламетра) і на прылеглай тэрыторыі ў радыусе 30 кіламетраў і больш пад эгідай Мінпрыроды ствараецца аўтаматызаваная шматузроўневая і шматфункцыянальная сістэма кантролю радыяцыйнай абстаноўкі. Пры яе фарміраванні ўлічваецца міжнародны (у першую чаргу еўрапейскі) вопыт стварэння аўтаматызаваных сістэм кантролю радыяцыйнай абстаноўкі ў раёне размяшчэння атамных станцый. Цяпер у зоне назірання БелАЭС функцыянуе базавы комплекс сістэмы кантролю.

СТАР. 2




## КАТЛЫ ПАВЫШАНАЙ РЫЗЫКІ

**Мінулай зімой у краіне зарэгістравана 19 надзвычайных сітуацый, звязаных з няправільнай эксплуатацыяй катлоў. Трагікамічны выпадак адбыўся ў гарадскім пасёлку Акцябрскі Гомельскай вобласці. Другі месяц вясны адзначыўся вельмі халодным надвор'ем, і жыхары прыватных дамоў былі вымушаны расчахліць ацяпляльную сістэму нанова. І вось 23 красавіка ў кацельнай аднаго жылога дома грымнуў выбух.**

Адразу зазначым: хата пашкоджанняў не атрымала, чаго не скажаш аб кацельнай — яна была раскурочана поўнасцю. Пасля высветлілася, што віноўнікам выпадку стаў самаробны металічны кацёл. Гаспадар хаты, які, на шчасце, не пацярпеў, патлумачыў, што гэты кацёл працаваў на цвёрдым паліве яшчэ з... 1972 года!

На жаль, настолькі адносна шчасліва заканчваюцца не ўсе выпадкі. Але як жа правільна эксплуатаваць гэтыя агрэгаты? Па парады карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да **галоўнага дзяржаўнага інспектара ўпраўлення нагляду за бяспекай абсталявання, якое працуе пад ціскам, і цеплавых электрастанцый Дзяржпрамнагляду МНС Марыны КАНДЗЕРСКАЙ.**

### ЗГУБІЎ КАНТРОЛЬ — АТРЫМАЎ ПРОБКУ

«Сезон» выбухаў бытавых катлоў прыходзіцца на пачатак і канец ацяпляльнага сезона. На гэта ўплываюць пераходы тэмпературы паветра ўначы ніжэй за нуль. Вада ў трубаправодах і пашыральных баках замярзае, і цыркуляцыя цепланосьбіта спыняецца. Утвараецца ледзяная пробка. Гэта адбываецца, як правіла, на гарышчах, дзе да ўцяплення труб і бакаў паставіліся абы-як ці ўвогуле яго праігнаравалі. Кацёл жа працягвае тапіцца, але пары выходзіць няма куды. Ціск паступова нарастае, контур агрэгата ў нейкую секунду ўжо не ў стане яго стрымліваць — і адбываецца выбух. А якія будуць наступствы гэтага, прадказаць ніхто не можа. Як мінімум давядзецца экстранна шукаць пасярод зімы грошы на новы кацёл і нейкім чынам аднаўляць памяшканне для яго.

Крыху радзей катлы ўзрываюцца з-за таго, што гаспадар не адчыніў перад пачаткам прапальвання запоры на трубаправодах. Паветра ў сістэме ацяплення быць не павінна — яно справакуе такую ж пробку, як і лёд. Кандэнсат у ніжняй кішэні коміна трэба выдаліць. Гэта дапаможа пазбегнуць атручэння чадным газам.

— Яшчэ да пачатку ацяпляльнага сезона мы рэкамендуем пачысціць унутраныя паверхні коміна і катла ад сажы, — раіць Марына Кандзерская. — Агляду патрабуе запорная і засцерагальная арматура. Сістэму ацяплення неабходна прамыць і запоўніць яе вадой. І вельмі важна ўцяпліць трубы і пашыральныя бакі, якія знаходзяцца ў памяшканнях, што не ацяпляюцца. Перад распальваннем катла трэба адкрыць лінію падсілкоўвання сістэмы ацяплення і кантрольную лінію запаўнення расшыральнага бака. Далей увагу трэба звяртаць на манометр. Калі з кантрольнай лініі вада не выходзіць, а ціск расце з незразумелай прычыны, гэта гаворыць аб тым, што недзе ўтварылася ледзяная корка.

СТАР. 6

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СГА пагоршыла прагноз росту сусветнага гандлю

Сусветная гандлёвая арганізацыя панізіла прагноз росту сусветнага гандлю ў 2016 і 2017 гадах. «Сусветны гандаль будзе расці ў 2016 годзе ўсяго на 1,7%, што значна менш у параўнанні з красавіцкімі прагнозамі ў 2,8%», — адзначаюць аўтары даклада СГА, апублікаванага ў аўторак у Жэневе. «Прагнозы на 2017 год таксама былі перагледжаны, — адзначаюць эксперты арганізацыі. — Чакаецца, што гандаль вырасце ў межах ад 1,8 да 3,1%, тады як раней прагназаваўся рост у 3,6%». Прычынай карэкціроўкі прагнозу ў дакладзе названа зніжэнне нарошчвання гандлёвага абароту ў Кітаі і Бразіліі, а таксама запаволенне росту паказчыкаў імпарту ў ЗША. Таксама адзначаецца, што ў 2016 годзе тэмпы росту гандлю могуць быць самымі павольнымі з 2009 года.

### Жыхары Азербайджана на рэферэндуме падтрымалі павелічэнне тэрміну прэзідэнцтва да 7 гадоў

Усе змяненні ў Канстытуцыю, ініцыіраваныя прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым, былі адобраны на праведзеным 26 верасня рэферэндуме. Шэраг паправак прадугледжвае ўвядзенне пастоў першага віцэ-прэзідэнта і віцэ-прэзідэнта, якія будуць прызначацца на пасаду і вызваляцца ад яе кіраўніком дзяржавы. Акрамя таго, на рэферэндуме прапаноўвалася павялічыць тэрмін прэзідэнцтва з пяці да сямі гадоў і пашырыць паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы, даўшы яму права аб'яўляць пазачарговыя выбары прэзідэнта і распускаць парламент. Змены таксама прадугледжваюць адмену ўзроставага цэнзу для прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта і зніжэнне з 25 да 18 гадоў мінімальнага ўзросту кандыдатаў у дэпутаты парламента. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева з нагоды пераканаўчай падтрымкі грамадзянамі Азербайджана прапанаваных канстытуцыйных змяненняў.

### У Мексіцы нарадзілася дзіця ад трох бацькоў



У Мексіцы паспяхова правялі ўнікальную аперацыю па штучным апладненні, у выніку якой з'явілася дзіця ад «трох бацькоў». Рэдкае спадчыннае захворванне жанчыны — сіндром Лея — не дазваляла мужу і жонцы з Іарданіі мець дзіця. Пара звярнулася па дапамогу да навукоўцаў з ЗША. Даследчыкі, якіх узначальваў Джон Чжан, ужылі тэхналогію з выкарыстаннем генетычнага матэрыялу яшчэ адной жанчыны-донара. Для зачацця эмбрыёлагі дасталі ядро з яйцаклеткі маці, перасадзілі ў яйцаклетку донара, а затым апладнілі яе і перанеслі эмбрыён назад у арганізм маці. Хлопчык Абрахам Хасан нарадзіўся 6 красавіка 2016 года. Як паведамляюць лекары, ён не атрымаў у спадчыну генетычныя захворванні сваіх бацькоў. Эксперты назвалі яго нараджэнне рэвалюцыйным. У сувязі з тым, што падобныя метады ўмяшання забароненыя ў ЗША, работа спецыялістаў праходзіла ў адной з мексіканскіх клінік.

ISSN 1990 - 763X
16187>
9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Больш за 90% жыхароў Зямлі дыхаюць забруджаным паветрам



Колькасць жыхароў Зямлі, якія пражываюць у раёнах з небяспечнымі ўзроўнямі забруджвання паветра, складае 92%, паведамляе Сусветная арганізацыя аховы здароўя. Штогод з-за забруджвання атмасферы паміраюць каля трох мільёнаў чалавек. Амаль 90% выпадкаў смерцяў, звязаных з забруджваннем паветра, адбываюцца ў краінах з нізкім і сярэднім узроўнем даходаў. Найгоршая сітуацыя ў Паўднёва-Усходняй Азіі і на захадзе Ціхаакіянскага рэгіёна. У пераважнай большасці выпадкаў (94%) гібель людзей выклікаюць не інфекцыйныя захворванні, а сардэчна-сасудзістыя хваробы, інсульты, хранічная абструктыўная хвароба лёгкіх і рак лёгкіх. Асноўнымі крыніцамі забруджвання паветра з'яўляюцца неэфектыўныя віды транспарту, бытавое паліва і спальванне адходаў, электрастанцыі, якія працуюць на вугалі і прамысловая дзейнасць. На якасць паветра могуць аказваць уплыў пыльныя буры, асабліва ў раёнах, блізкіх да пустыняў.

КОРАТКА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «25 гадоў Садружнасці Незалежных Дзяржаў: вынікі, перспектывы».

**Генеральнае консульства Беларусі адкрыецца ў Гуанчжоў (Кітайская Народная Рэспубліка) у 2016 годзе.**

Белінвестбанк і Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця падпісалі крэдытнае пагадненне на 8 млн еўра па праграме фінансавання ўстойлівай энергетыкі для Беларусі.

**У свеце з'явіліся так званыя квадрывакцыны, якія маюць усе чатыры варыянты вірусаў грыпу. У Беларусі гэтая вакцына знаходзіцца на стадыі рэгістрацыі, і, як мяркуецца, у наступныя сезоны будзе выкарыстоўвацца.**

Сцены Партрэтнай залы Мірскага замка цяпер упрыгожаны арыгінальнымі партрэтамі, якія музей набыў у князя Канстанціна Гогенлоэ-Шылінгсфюрста, які жыве ў Германіі.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «...ЯК МОЖНА НЕ ЛЮБІЦЬ СВАЁ?»

**Леанід Мікалаевіч КАЛІНКОВІЧ, ветэран Вялікай Айчыннай вайны:**

— Да роднай мовы я, нашчадак сялян-палешукоў, ішоў досыць доўга. Наша сям'я — сям'я вайскоўца-камандзіра — жыла, як правіла, у розных ваенных гарадках, дзе беларускую ў школах не вывучалі, у побыце не карысталіся. Але ж ведаць яе мне вельмі хацелася.

А потым яшчэ і неабходнасць такая з'явілася. Скончыўшы вячэрнюю школу і — завочна — юрыдычны інстытут, я стаў працаваць у крымінальным вышуку, пастаянна ездзіў па камандзіроўках, размаўляў з самымі рознымі людзьмі. Мне трэба было адразу ж і дакладна разумець, што яны кажуць...

І таму, калі вырашылася пытанне з жыллём у Мінску, я стаў пастаянна выпісваць «Звязду». Газета мне вельмі дапамагла ў вывучэнні беларускай мовы. Да таго ж тут друкаваліся ўсе законы, шмат было іншай цікавай і патрэбнай інфармацыі. Так што адмаўляцца ад падпіскі ніяк не выпадала...

А тым больш не выпадае цяпер, праз добрых пяцьдзясят гадоў. Падабаецца ў газеце разнастайнасць тэматыкі, грунтоўнасць у асвятленні жыцця моладзі, праблем здароўя, мінулай вайны, міжнародных адносін. Пастаянна чытаючы «Звязду», шмат цікавага даведваешся пра жыццё людзей, у тым ліку — найлепшых беларусаў. З карысцю бавіцца час і за звяздоўскімі крыжаванкамі, за вясёлымі ды праўдзівымі гісторыямі з жыцця чытачоў...

Так што ад мяне шчыры дзякуй усім — і былым, і сённяшнім — працаўнікам рэдакцыі. А чытачам яе — пажаданне: не адмаўляйцеся ад роднай мовы, ад газеты. Бо яно ж грэх — не любіць сваё.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

28 верасня 2016 г.
№ 16 (379)


**БЕЗ МЕЖАЎ**

## ПРАЕКТЫ ПАД АСАБІСТУЮ АДКАЗНАСЦЬ



**На 3-м форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што рэгіёнам трэба больш шчыльна супрацоўнічаць паміж сабой. Акрамя палітычнай волі, добразычлівасці, жадання быць разам, павінны мець месца канкрэтныя справы, узаемавыгадныя як для беларусаў, так і для расіян. Менавіта тады, на форуме, і было вырашана правесці ў Магілёве сустрэчу з удзелам прадстаўнікоў улады, бізнесу і грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай і Бранскай абласцей. Яе асаблівасць у тым, што асноўнымі ўдзельнікамі тэматычных секцый сталі маладыя людзі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Рабілася спроба абагульніць вопыт двух рэгіёнаў у рэалізацыі маладзёжнай палітыкі, каб стварыць больш спрыяльныя ўмовы для зближэння гэтай найбольш ініцыятыўнай і прагрэсіўнай часткі насельніцтва. У Магілёве завязаліся новыя кантакты, якія абяцаюць перарасці ў сумесныя справы і праекты. На гэта з абодвух бакоў ускладаюцца вялікія спадзяванні.**

— Тэма міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў сферы маладзёжнай палітыкі ў рамках Саюзнай дзяржавы актуальная ўжо толькі тым, што будучае нашых краін за сённяшнімі юнакамі і дзяўчатамі. У нас агульныя карані, менталітэт, мысленне. Калі мы зблізім нашу моладзь, у яе будзе больш агульных напрацовак, — кажа **старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Анатоль ІСАЧАНКА.** — З Бранска да нас прыязджалі ў асноўным практыкі, людзі, якія зацікаўлены ў прамым супрацоўніцтве. Разам са сваімі аднадумцамі з Магілёва яны абмяркоўвалі агульныя праекты, аналізавалі, наколькі яны могуць быць карыснымі для абодвух бакоў.

***— Наколькі плённай была гэта работа?***

— Мерапрыемства было праведзена ў сціслыя тэрміны, але мы змаглі зрабіць шмат чаго за такі кароткі час. Было падпісана 9 пагадненняў, два датычыліся непасрэдна эканамічнага складальніка. Турыстычная фірма Магілёўаблтурыст і бранскае турыстычнае бюро Апэкс-тур узяліся за распрацоўку агульнага турыстычнага маршруту. Сумесная дзейнасць распачата паміж Бранскім абласным бізнес-інкубатарам і Магілёўскім агенцтвам развіцця.

***— Якіх вынікаў можна чакаць ад гэтай сустрэчы?***

— Каб не было ўсё абстрактна, мы падпісалі план мерапрыемстваў, дзе пазначаны каля 50 пунктаў і канкрэтна прапісаны прозвішчы, хто за што адказвае. Вызначыліся, што раз у квартал будзем збірацца і разглядаць ход выканання гэтых планаў. Тут усё цесна звязана — і маладзёжнае супрацоўніцтва, і эканоміка. Перамовы паміж турыстычнымі прадпрыемствамі выльюцца ў экспарт паслуг, а гэта жывыя грошы. Абмен моладдзю дасць магчымасць закласці трывалыя сувязі на будучае. Работа паміж бізнес-інкубатарам і агенцтвам развіцця можа вырасці ў нейкі сур'ёзны сумесны праект. Лепшыя ідэі будзем выносіць на ўзровень Саюзнай дзяржавы, падымаць на чарговым форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Калі выразна абазначаны задачы, іх працай рашаць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*



Ганна КАРАБАНЬКОВА *(у цэнтры)* са сваімі пакупніцамі.

**СЯРОД ЛЮДЗЕЙ**

## ГАСПАДЫНЯ АМУРСКАЙ КРАМЫ

**У вёсцы Амур Глускага раёна сваёй крамы няма. А ўсё таму, што Амур — неперспектыўны населены пункт, які дажывае свой век: у ім толькі дзевятнаццаць жыхароў. Хоць па вёсцы і праведзены газ, вада, электрычнасць, моладзь тут не хоча сяліцца. Пра гэта мне нагадаў амурскі староста, пенсіянер Андрэй Архіпавіч Касько, калі мы сядзелі на лаўцы і чакалі краму на калёсах — аўталаўку. Побач сабраліся жанчыны пенсійнага ўзросту. Гаварылі пра справы жыццёвыя, вяскоўкі дзяліліся ўспамінамі, радаваліся, што тройчы на тыдзень да іх прыязджае новенькая аўталаўка, поўная свежых прадуктаў. Амураўцы прывыклі і да гаспадыні крамы, прадаўшчыцы Ганны Карабаньковай, — яна ветлівая, выконвае замовы вяскоўцаў, ніколі не павышае голас. З ёй добра мець справы.**

У назначаны час — па раскладзе — аўталаўка імчыць па гравійцы да Амура. Апошні паварот на вёску, цэнтральнае скрыжаванне, прыпынак. Адчыняюцца дзверы кабіны, і... сваёй усмешкай Ганна вітае амурцаў, спешна адчыняе краму, становіцца за прылавак. Толькі паўгадзіны адведзена на работу ў гэтай вёсцы, трэба спяшаецца далей — у наступныя населеныя пункты.

— Тры гады я ў Глускім райпа на аўталаўцы, а ў гандлі ўжо дваццаць гадоў, — кажа Ганна Карабанькова. — Работа адказная, васямнаццаць вёсак трэба аб'ехаць, нікога не забыць. Для ўсіх і для кожнага пакупніка — ад малога да старога — тавару павінна быць дастаткова. Мне падабаецца, калі пакупнікі задаволены асартыментам магазіна і сваім выбарам.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**



**ПАСЛЯ ПУБЛІКАЦЫІ Ў «МС»**

## КАЛІ Ж ЗУБР ВЕРНЕЦЦА Ў ПУШЧУ?

**У папярэднім выпуску «МС» («Звязда» ад 14 верасня) быў надрукаваны матэрыял «Зубр — не экзотыка...». У адказ на публікацыю рэдакцыя атрымала допіс вядучага навуковага супрацоўніка Нацыянальнага парка «Белавежская пушча» кандыдата біялагічных навук Аляксея БУНЕВІЧА. У электронным лісце гаворыцца:**

«Выпадак, калі зубр застаўся на доўгі час у чарадзе кароў, неардынарны. Да гэтага самцы-мігранты ніколі не заставаліся з каровамі, хоць да чарады кароў не аднойчы падыходзілі. Паведамленне аб паяўленні зубра побач са статкам кароў у вёсцы Лелікава Кобрынскага раёна мы атрымалі, як толькі звера там заўважылі. Па выніках выезду супрацоўнікаў нацыянальнага парка на месца было зафіксавана знаходжанне ў статку кароў самца зубра ва ўзросце каля пяці гадоў. Было прынятае рашэнне забраць яго адтуль.

Але працэдура вырашэння пытання патрабуе часу. Зубр занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі, забраць яго з жывой прыроды магчыма толькі на падставе рашэння Мінпрыроды. Папярэдне жывёліну належыць перавесці з асноўнага генафонду ў рэзервовы, для чаго подпісы павінны паставіць прадстаўнікі Мінпрыроды, Акадэміі навук, Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага



і раслiннага свету, дзяржаўнай ветслужбы. Указаная працэдура намі праведзеная. Зубр пераведзены ў рэзервовы генафонд па адным з крытэрыяў пастановы Мінпрыроды: «... маладыя самцы, якія пакінулі раён субпапуляцыі, мігрыравалі на адлегласць больш за 50 кіламетраў і не вярнуліся назад на працягу трох месяцаў».

Яшчэ адна праблема абумоўлена тым, што юрыдычна зубр не можа лічыцца нашым (уласнасцю Нацыянальнага парка лічацца зубры ў радыусе 50 кіламетраў ад межаў пушчы), хоць фактычна ён, хутчэй за ўсё, родам з Белавежскай пушчы. Таму спатрэбіліся яшчэ ўзгадненні з тэрытарыяльнымі прыродаахоўнымі органамі. Яны таксама праведзеныя.

Варта сказаць, што паралельна з афармленнем дакументацыі мы прадпрымалі канкрэтныя дзеянні. Была завезеная жывалавушка, каля яе размясцілі корм. Але ў той жа час сталі падкармліваць і калгасных кароў. Зразумела, што зубр праігнараваў лавушку і карміўся разам з каровамі. На парадак дня паўстала пытанне аб тым, каб усыпіць зубра спецыяльнымі прэпаратамі і так вывезці. Але ў верасні стаяла спёка, у такое надвор'е праводзіць імабілізацыю жывёл не рэкамендуецца па прычыне іх магчымай гібелі.

А 20 верасня мы атрымалі ўсе неабходныя дакументы на жываадлоў зубра. Таму ў наступныя дні плануем яго адлавіць і перавезці ў пушчу. Нацыянальны парк зацікаўлены забраць гэтага зубра і памясціць яго ў экскурсійных вальерах у сувязі з яго «цікавай біяграфіяй».

***P.S.*** *Цяпер ён будзе жыць у вальеры*

**Калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, стала вядома, што зубра, якому мясцовыя пастухі далі мянушку Мішка, забралі, нарэшце, у Нацыянальны парк. Пакідаць у лесе яго не было сэнсу: звер, які пераадолеў 130 кіламетраў, наўрад ці адмовіўся б ад новых «пошукаў прыгод». Адлоўленага падарожніка пасялілі ў экскурсійны вальер разам з трыма самкамі. Цяпер экскурсаводы будуць расказваць наведвальнікам цікавую гісторыю жыцця зубра, які аднойчы пакінуў векавы лес і прыстаў да статка кароў...**

**НОВЫЯ ПРАВІЛЫ**

## СЦЯНА СМУТКУ НА ВЯСКОВЫХ МОГІЛКАХ

***А чаму б і не, лічыць старшыня Ждановіцкага сельскага Савета дэпутатаў Ала Дубко***

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

**У канцы ліпеня Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі зацвердзіла новыя правілы ўтрымання і добраўпарадкавання могілак. Ці дапаможа гэта навесці парадак на вясковых пагостах, карэспандэнт «Звязды» спрабавала разабрацца на прыкладзе Ждановіцкага сельсавета.**

На тэрыторыі Ждановіцкага сельсавета знаходзіцца 6 грамадзянскіх могілак: «Зарэчча-1», «Ждановічы», «Качына», «Тарасава», «Яркова» і «Дзегцяроўка». Іх, бясспрэчна, цяжка параўноўваць з іншымі вясковымі пагостамі як Мінскага раёна, так і ўсёй Беларусі. Асаблівасць гэтых месцаў пахавання ў тым, што знаходзяцца яны паблізу ад Мінска і кальцавой дарогі. Таму запатрабаваныя і ў сталічных жыхароў.

— Калькі часу таму могілкі вярнулі на баланс сельсаветаў Мінскага раёна. Пасля таго, як была ліквідавана ўстанова «Рытуальныя паслугі Мінскага раёна», сельсаветы дэлегавалі паўнамоцтвы па абслугоўванні могілак КУПам — сваім камунальным унітарным прадпрыемствам. Яны створаны практычна на базе кожнага сельсавета, — адзначыла старшыня Ждановіцкага сельскага Савета Ала Дубко. — На некаторых могілках былі ўсталяваны кантэйнерныя пляцоўкі, а дзесьці мы іх уладкоўвалі самі. Згодна з санітарнымі нормамі ўтрымання месцаў пахавання, усе могілкі агароджаны. А смецце рэгулярна прыбіраецца КУПам «Ждановічы-сэрвіс», дзе для гэтага ёсць уся неабходная тэхніка. Акрамя таго, работнікі прадпрыемства абкошваюць тэрыторыю, што прылягае да могілак, паміж магіламі, падсыпаюць дарожкі.

> Паводле новых правілаў, норма для двайнога пахавання мясцовых жыхароў — 2 на 2,3 метра — прадастаўляецца бясплатна.

Як прызналася Ала Уладзіміраўна, ёсць і праблемы. Не, не прыборка вянкоў ды кветак. Вываз буйнагабарытных адходаў — старых помнікаў, агароджаў, якія сваякі мяняюць на новыя. Акрамя таго, могілкі размяшчаюцца сярод лесу. Цягам часу дрэвы старэюць, ствараюць небяспеку: могуць упасці і пашкодзіць помнікі, агароджы. Спілаваць іх складана, паколькі машына не можа падысці ўшчыльную. Ды і сама работа патрабуе значных фінансавых затрат.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Але мы спраўляемся, — кажа мая суразмоўца.— Цяпер, перш чым адводзіць новую тэрыторыю для могілак, расчышчаем яе ад лесу або, калі гэта магчыма, выдзяляем зямлю, дзе няма дрэў. Як напрыклад, у вёсках Тарасава, Яркова. Паводле новых правілаў пахавання, зацверджаных пастановай Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, для жыхароў Ждановіцкага сельсавета месца для пахавання выдзяляецца бясплатна, для ўсіх іншых, у прыватнасці, мінчан, грамадзян іншых рэгіёнаў адно месца каштуе 50 базавых велічынь.

Менавіта гэта дапамагае спыніць паток ахвотных пахаваць сваякоў і блізкіх на могілках Ждановіцкага сельсавета. Гэта стрымліваючы фактар.

— Мы сочым за тым, каб не было самавольных пахаванняў. Гэтыя абавязкі, у тым ліку, ускладваюцца і на наглядчыкаў, — на шэсць могілак іх чацвёра. Мы імкнёмся кантраляваць нават прыватнае добраўпарадкаванне, — запэўніла Ала Дубко. — Напрыклад, радня вырашыла замяніць стары помнік або агароджу, уладкаваць тэрыторыю. Перш за ўсё наглядчыкі кантралююць, каб былі захаваны памеры пахаванняў. Паводле новых правілаў, норма для двайнога пахавання мясцовых жыхароў — 2 на 2,3 метра — прадастаўляецца бясплатна. Гаспадар, які адказвае за добраўпарадкаванне, піша нам папярэднюю заяву.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)***

**У СВАЁЙ АКРУЗЕ**

## Зінаіда МАНДРОЎСКАЯ: «Магу адкрыта глядзець у вочы сваім выбаршчыкам»



**Ёсць два процілеглыя пункты гледжання на работу дэпутата. Адны лічаць, што ён можа літаральна ўсё. Іншыя ж, наадварот, наракаюць, што народны выбраннік не мае ні падначаленых, ні вялікай улады, адпаведна, зрабіць можа мала. Зінаіда Мандроўская, дэпутат ад Пінскай гарадской выбарчай акругі №14, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях, працавала ў чацвёртым і пятым скліканнях і, думаю, прытрымліваецца першага пункту гледжання на магчымасці парламентарыя. Зараз яна можа з годнасцю паглядзець на вынікі сваёй працы — зроблена сапраўды шмат, хоць, па яе словах, гэта было няпроста ды і не ўсё ўдалося.**

### Вынікамі ў цэлым задаволена

***— Зінаіда Міхайлаўна, як вы сябе адчуваеце напрыканцы вашай дэпутацкай кар'еры?***

— Абсалютна спакойна, ёсць нават пэўная задаволенасць, бо я выканала тыя мэты, якія ставіла перад сабой. Цалкам спакойна ўсведамляю, што ўзрост ёсць узрост і, натуральна, трэба будзе пераходзіць да цалкам іншага стылю жыцця. Але гэта нармальная з'ява. Гэта добра, што чалавек дажыў да таго, што выканаў сваю місію і можа яшчэ адпачыць.

***— Чым плануеце заняцца, калі запрацуюць дэпутаты новага склікання?***

— Канкрэтных планаў пакуль няма. Думаю, буду займацца грамадскай работай.

> Нельга дэпутата, любога іншага чалавека надзяліць такімі паўнамоцтвамі, каб ён даваў указанні ўладзе, а яна давала яму справаздачу. Натуральна, дэпутату няпроста.

### Абарона неабароненых

***— Што вам найбольш запомнілася за восем гадоў дэпутацкай работы?***

— Запомнілася тое, што мы змаглі ўтрымаць сітуацыю ў развіцці Саюзнай дзяржавы. Наша камісія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, у якую я ўваходжу, зрабіла вельмі шмат для таго, каб цалкам захаваць усе сродкі масавай інфармацыі Саюзнай дзяржавы, далучыць да гэтай праблемы ўсе структуры ўлады — як расійскія, так і беларускія.

***— А чым вы ганарыцеся?***

— Перад сваім выбраннем я працавала дырэктарам прадпрыемства, дзе больш за 50% супрацоўнікаў — інвалiды. Я паабяцала ім пайсці ў камісію па працы, сацыяльных пытаннях, справах інвалідаў — так называлася яна ў чацвёртым скліканні. Нягледзячы на тое, што я інжынер і эканаміст, на працягу чацвёртага, пятага скліканняў нашай камісіі з дапамогай іншых дэпутатаў урада удалося цалкам сфарміраваць заканадаўчую базу па абароне сацыяльна неабароненых слаёў насельніцтва — людзей з абмежаванымі магчымасці, у прыватнасці інвалідаў. Цалкам усе законы былі дапрацаваныя, і мы далучыліся да канвенцыі ААН па правах інвалідаў. Мы перапрацавалі наступныя нарматыўныя дакументы: Закон Рэспублікі Беларусь «Аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў», Закон «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь» і Закон «Аб сацыяльным абслугоўванні», а таксама цалкам перагледзелі заканадаўства ў тым, што тычыцца забеспячэння правоў маці, якія маюць дзяцей-інвалідаў. У прыватнасці, замацавалі іх права атрымаць бальнічны ліст на час рэабілітацыі дзіцяці і магчымасць сумеснага аздараўлення маці і дзіцяці-інваліда.

Калі я была дэпутатам чацвёртага склікання, у сваёй акрузе ў Пінску я стварыла камісію па справах інвалідаў. Мэр горада ўзначаліў яе, я стала сустаршынёй і праводзіла пасяджэнні з удзелам усіх грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў і прадстаўнікоў мясцовых улад. Пасяджэнні праводзіліся кожны квартал, і першым пытаннем заўсёды стаяў абавязковы разгляд тых праблем, якія ставіліся на папярэднім. Акрамя гэтага, у кожнага была магчымасць выступіць з уласнымі прапановамі, задаць свае пытанні.

Што да работы ў парламенце, то скажу, што напачатку мае прапановы, ініцыятывы не заўсёды падтрымліваліся. Так, у свой час я выступіла з прапановай па абмежаванні работы гульнявых аўтаматаў. На працягу двух гадоў я білася над гэтым... У выніку атрымалася зрабіць так, што ўсё-такі адпаведныя пастановы ўрада прайшлі.

Таксама праводзіла работу па забароне алкалоіднага опію, займалася гэтым чатыры гады. У Пінску з усіх нарказалежных 79% складалі опійныя наркаманы! Я праводзіла нарады ў Адміністрацыі Прэзідэнта, яго памочнікаў, вельмі шчыльна працавала з Міністэрствам унутраных спраў — перш чым выдалі ўказ. Рэакцыя пайшла. Колькасць опійных наркаманаў рэзка зменшылася. Наступнай тэмай сталі спайсы. Я працавала і над гэтым, у выніку рашэнне таксама ўсюды прайшло.

Трэба разумець, што не ўсё атрымліваецца зрабіць так, як ты лічыш неабходным. Тыя пытанні, якія з майго пункту гледжання маглі быць вырашаны, былі вырашаны як мінімум у палове выпадкаў. Я абсалютна спакойна да ўсяго стаўлюся. Мой пункт гледжання таксама не можа прэтэндаваць на абсалютную беззаганнасць.

### ...Працы ў парламенце хапае

***— Вы былі дэпутатам Палаты прадстаўнікоў два скліканні запар...***

— Балатавацца ў дэпутаты другі раз мне было вельмі проста. Людзі, мясцовыя ўлады ведалі, што я буду адстойваць законныя правы людзей. Я нават не адчувала ніякага негатыву. Выбаршчыкі сустракалі мяне добра, я магла адкрыта глядзець ім у вочы — і цяпер таксама магу. Я заўсёды давала справаздачу па тых праблемах, з якімі звярталіся да мяне. Водгукі на маю работу, нават ад прадстаўнікоў апазіцыі, былі, нягледзячы ні на што, станоўчымі. Я ніколі не адмаўляла нікому ў дапамозе, у звычайнай размове. Кожны раз, калі ў нас была работа ў акрузе, я наведвала абсалютна ўсе прадпрыемствы горада, не прапусціла ніводнага прыёму грамадзян.

***— Калі меркаваць па вашым прыкладзе, дэпутат, сапраўды, можа зрабіць многае. У той жа час нельга сказаць, што ў дэпутата вельмі вялікія паўнамоцтвы. Так, напрыклад, калі да яго паступае зварот, ён можа толькі паклапаціцца, каб мясцовыя ўлады дапамаглі чалавеку... А як вы лічыце, дэпутат валодае дастатковымі паўнамоцтвамі?***

— Нельга дэпутата, любога іншага чалавека надзяліць такімі паўнамоцтвамі, каб ён даваў указанні ўладзе, а яна давала яму справаздачу. Натуральна, дэпутату няпроста. І ніколі не было проста. Парламентарый павінен валодаць уменнем мысліць аналітычна, пераконваць. Трэба паглядзець на паднятае выбаршчыкам пытанне з усіх бакоў.

Прывяду такі прыклад. У Пінску тры ракі. У летні перыяд вельмі шмат было дачнікаў, якія дабіраліся да сваіх участкаў на параходзе — так больш зручна і хутка. На параходзе ехаць 12 кіламетраў, на аўтобусе, пакуль той аб'едзе ўсе вёскі, балоты, будуць усе 50. І вось з'явіўся ўказ, калі на праезд на транспартных сродках аўтобусных і чыгуначных зносін пенсіянерам прадастаўляліся льготы. Але ў дакуменце быў упушчаны рачны транспарт. Натуральна, гэта няправільна. Я гэтым займалася, і цяпер ільготы на праезд пенсіянерам прадастаўляюцца і на рачным транспарце. Але я патраціла на вырашэнне праблемы не адзін месяц. І гэта толькі адзін выпадак.

Працы ў парламенце больш, чым у якой іншай галіне, — было б толькі жаданне рабіць яе. А таксама сілы — адстаяць сваё меркаванне.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

ДЗЕЛАВЫЯ ЛЮДЗІ

# СТАРТУЙ УВЕРХ!

## *Ад малога бізнесу вялікая карысць*

**На Віцебшчыне кіраўнікі на месцах павінны дасягнуць канкрэтных паказчыкаў па развіцці прадпрымальніцтва. Аблвыканкам давёў адпаведнае заданне. У прыватнасці, па аб'ёме выручкі ад рэалізацыі прадукцыі і паслуг. Напрыклад, у Талачынскім раёне ён павінен перавышаць 84%, у Аршанскім — каля 46%, у Віцебскім раёне — больш за 38%. Для параўнання, у абласным цэнтры — 23%. Даведзены і планавыя заданні па колькасці суб'ектаў прадпрымальніцтва на 1 тысячу занятых у эканоміцы.**

### Разуменне ёсць

Што тычыцца падаткаў, дзякуючы суб'ектам малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, бюджэт вобласці напаўняецца на чвэрць. У Віцебску — на ўзроўні 17—18%.

Развіццё малога і сярэдняга бізнесу на чарговым Усебеларускім народным сходзе вызначана адным з прыярытэтаў.

— Гэта паспрыяе рэалізацыі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2016—2020 гады. Кіраўнік дзяржавы ў сваім выступленні падкрэсліваў, што органы ўлады ўсіх узроўняў абавязаны спрыяць падтрымцы дзелавой ініцыятывы, — нагадвае выканаўчы **дырэктар грамадскай арганізацыі «Асацыяцыя наймальнікаў і прадпрымальнікаў» Ніна ЛУК'ЯНАВА.**

Яна падкрэсліла, што мясцовая ўлада канструктыўна супрацоўнічае са структурамі, якія садзейнічаюць прадпрымальнікам. Хай пакуль не так плённа, як магло б быць у ідэале, але разуменне ёсць. Менавіта недзяржаўны сектар эканомікі — гэта важнейшы інструмент і для самазанятасці, і для творчай рэалізацыі людзей.

Дарэчы, згаданая вышэй асацыяцыя выйграла конкурс малых грантаў амерыканскага міжнароднага прыватнага цэнтра прадпрымальніцтва. У верасні-лістападзе запланаваны «круглыя сталы» для бізнесменаў, па іх выніках вызначаць блокі праблем, рашэнне якіх у кампетэнцыі мясцовай улады і рэспубліканскіх органаў кіравання. Члены экспертнага савета асацыяцыі — паспяховыя бізнесмены — будуць бясплатна кансультаваць прадпрымальнікаў і пачаткоўцаў.

### ...І стартап-школы

А Цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва і трансферу тэхналогій таварыства с дадатковай адказнасцю «Віцебскі бізнес-цэнтр» у ліку іншага спецыялізуецца на арганізацыі стартап-школ.

— Гэта новы некамерцыйны праект, які спрыяе запуску і развіццю бізнесу. Большасць бізнесаў ва ўсім свеце «пачынаюцца з нуля» — гэта значыць стартуюць уверх. Стартап-школа спрыяе рэалізацыі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, дзе асаблівая ўвага — папулярызацыі навукова-тэхнічнай творчасці, вынаходніцтва, інавацыйнага прадпрымальніцтва, — расказвае **дырэктар цэнтра Леанід ШУР.**

Базавы прынцып такіх школ агульны: бізнесу можа навучыць толькі прадпрымальнік. Таму эксперты — людзі, якія на ўласных поспехах і памылках «раскруцілі» бізнес і кіруюць ім. Да канца года ў стартап-школах апрабуюць 60 дзелавых ідэй. І кожная можа стаць паспяховым бізнесам.

Адзін з яскравых прыкладаў рэалізацыі ўдалай ідэі — праект маладога гараджаніна, якога падтрымаў вядомы бізнесмен.

— Дапамагаю вельмі ініцыятыўнаму хлопцу, які захацеў займацца прадпрымальніцтвам. Ён прапанаваў ідэю ў галіне перапрацоўкі другасных матэрыяльных рэсурсаў. Афішаваць падрабязнасці пакуль што не буду. Я ўжо ўзяўся за фінансаванне і суправаджэнне праекта, — удакладняе **першы намеснік старшыні савета «Асацыяцыі наймальнікаў і прадпрымальнікаў», намеснік старшыні гарадскога савета па прадпрымальніцтве Васіль ЛАМАКІН.** Ён — заснавальнік некалькіх прадпрыемстваў, займаецца інвеставаннем.




### Са школьнай парты

Сёлета ў Віцебску адбыўся тэматычны форум «Першы крок у бізнесе». Удзельнікі падзяліліся вопытам і праблемамі.

— Мы вучым школьных педагогаў, у тым ліку і будучых, а яны — дзяцей. Але на такія «кампаніі» няма сродкаў у бюджэце. Як і схемы работы... Наогул, нашы вопыт і кваліфікацыя ў якасці трэнераў, кансультантаў, маркетолагаў мала запатрабаваныя на Віцебшчыне. Таму працуем у іншых рэгіёнах, — сказаў Леанід Шур.

Паводле яго слоў, добрая перспектыва ў школьных бізнес-кампаній экалагічнага кірунку. На Віцебшчыне іх ужо больш за 20. Экалагічны праект рэалізуецца на базе ўстаноў адукацыі Віцебскага раёна.

Развіццё эколагаарыентаванага бізнесу можа істотна змяніць экалагічную сітуацыю ў Беларусі. Гэта магчымасць вырашыць праблемы рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. У свеце назапашаны найбагацейшы вопыт экалагічнага прадпрымальніцтва. І ён даказвае не толькі яго жыццёвую неабходнасць, але і эканамічную выгаду.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

НАДЗВЫЧАЙНАЯ СІТУАЦЫЯ

# НА ВАРЦЕ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ,

## *або Як супрацоўніцы сельвыканкама паказалі прыклад адвагі і рашучасці*

**Пры падрыхтоўцы матэрыялу аб прафілактыцы пажараў у дамах састарэлых, адзінокіх вяскоўцаў давялося звярнуцца да першага намесніка начальніка Пружанскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Андрэя ПІСЬМАНА. Андрэй Сяргеевіч падрабязна і грунтоўна расказваў, што за гэты год супрацоўнікамі аддзела абследавана 2946 домаўладанняў. У 948 з іх пражываюць інваліды, адзінокія і тыя грамадзяне, якія жывуць адны, але маюць блізкіх сваякоў. Па выніках абследаванняў 168 грамадзян прыцягнуты да адказнасці за парушэнне правілаў пажарнай бяспекі.**

Гэта значыць, у некага развальвалася печ, іншыя мелі электрычную праводку ў аварыйным стане альбо нават устанаўлівалі прыборы кустарнай вытворчасці. Яны і былі аштрафаваныя. Здараецца, пажарныя інспектары пішуць лісты ў сацыяльную службу, у органы мясцовага кіравання, накіроўваюць звароты дзецям пажылых грамадзян. У сельскай мясцовасці інспектары па НС працуюць у цеснай звязцы з сельвыканкамамі, падкрэсліў Андрэй Пісьман.

У шэрагу прыкладаў работы сельсаветаў Андрэй Сяргеевіч згадаў і пра старшыню сельскага Савета, а таксама кіраўніка спраў з Мокрага, якія, стаўшы сведкамі надзвычайнай сітуацыі, не разгубіліся, а павялі сябе як сапраўдныя ратаўнікі і вызвалілі чалавека з вогненнага палону.

У той дзень Святлана Ханавец, старшыня сельскага Савета, і Вольга Пракаповіч, кіраўнік справамі, займаліся будзённай работай — аб'язджалі аддаленыя населеныя пункты сельсавета. Недалёка ад вёскі Краснае заўважылі дым, не падобны на дым з коміна. Спачатку падумалі, што гаспадары нешта паляць на падворку. Калі пад'ехалі бліжэй, то ўбачылі, што дыміць з-пад страхі. Аказалася, гарэў дах у хаце пенсіянеркі Вольгі Рыгораўны Ванекі. На дапамогу ўжо спяшаўся і сусед бабулькі Іосіф Сахарэвіч.



А. ГАНЧАРОЎ уручае падарункі С. ХАНАВЕЦ і В. ПРАКАПОВІЧ.

Яны падышлі да хаты ўтрох і ў першае імгненне зрабілі памылку — шырока расчынілі дзверы. Як адзначаюць у такіх выпадках спецыялісты, ціхае гарэнне знішчыла кісларод у сенцах, а прыток свежага паветра справакаваў лаву агню. Полымя, нібы выбух, ахапіла пярэдні пакой, і дом хутка стаў напаўняцца едкім дымам. Людзі вымушаны былі ўпасці на зямлю, але ў наступныя секунды сарыентаваліся, што да дома трэба падыходзіць з другога боку...

Сусед гаспадыні выбіў вонкавую шыбу, але за ёй была яшчэ адна рама, якую ў наступны момант дошкай, што трапіла пад руку, выціснула Святлана Мікалаеўна. Тут жа прыйшла на дапамогу і Вольга Уладзіміраўна — выцягнулі пажылую жанчыну, якая ўжо літаральна страчвала прытомнасць ад дыму. Тым часам пад'ехаў і пажарны разлік, які паспелі выклікаць адразу. Высветлілася, што прайшло ўсяго некалькі хвілін, а людзям, якія ратавалі чалавека з вогненнага пекла, падалося, што прайшлі гадзіны...

Праз нейкі час адважных жанчын запрасіў да сябе начальнік Пружанскага райаддзела па надзвычайных сітуацыях Андрэй ГАНЧАРОЎ. Ён падзякаваў Святлане Ханавец І Вользе Пракаповіч за смелыя і рашучыя дзеянні ў выратаванні чалавека, уручыў падарункі і кветкі.

Але ж нашы жанчыны, як аказалася, могуць быць не толькі знаходлівымі ды адважнымі ў крытычнай сітуацыі, але і занадта сціплымі ў паўсядзённым жыцці.

— Не, не трэба пісаць пра наш учынак! — замахала рукамі кіраўнік справамі Вольга Пракаповіч. — Як толькі памясцілі ў раённай газеце наш здымак, статыстыка пажараў па сельсавеце пагоршылася, нібы хто сурочыў.

— Ну і чым вы тады лепшыя за бабульку, якая баялася аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка? — спрабую перавесці размову на жарт.

> Сусед гаспадыні выбіў вонкавую шыбу, але за ёй была яшчэ адна рама, якую ў наступны момант дошкай, што трапіла пад руку, выціснула Святлана Мікалаеўна.

А калі гаварыць сур'ёзна, то ў надзвычайнай сітуацыі чалавек здольны разгубіцца, паддацца паніцы, дапускаць памылкі адна за другой і тым самым страціць дарагі час. Калі ж нехта здолее сабрацца, зрабіць усё, як належыць, і тым самым выратаваць нечае жыццё, аб гэтым, лічу, трэба гаварыць як аб прыкладзе для іншых. Што датычыць статыстыкі, то яна — рэч непастаянная і абумоўленая многімі фактарамі. У Мокраўскім жа сельсавеце, як расказала Вольга Пракаповіч, яшчэ да наступлення ацяпляльнага сезону правялі абследаванне домаўладанняў, якія трапляюць пад асаблівую ўвагу. Найперш гэта адзінокія пажылыя людзі — іх 18 чалавек — і тыя, хто пражывае адзінока, такіх у сельсавеце 235. Дык вось да адной бабулькі заехалі, а ў яе няма апавяшчальніка на звычайным месцы, сталі пытацца, куды ён падзеўся. «А мае вы дзеткі, — кажа гаспадыня — ён мяне пужаць стаў: пішчыць і ноччу, і днём, дык я яго ў кош паклала і за хлеў вынесла — пішчы колькі хочаш». Аказалася, прыбор такім чынам сігналіў аб тым, што заканчваюцца батарэі сілкавання. Батарэйкі памянялі, апавяшчальнік вярнулі на месца. Цяпер супрацоўніцы сельсавета заўсёды бяруць з сабой у запас батарэйкі, калі ездзяць па вёсках.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*
*Пружанскі раён.*

# СЦЯНА СМУТКУ НА ВЯСКОВЫХ МОГІЛКАХ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Начальнік участка Дзмітрый Атрашонак прыязджае на могілкі і даводзіць прысутным пра неабходныя памеры. Лішняя ж тэрыторыя па новых правілах каштуе 20 базавых велічынь за адзін квадратны метр. Многія, канешне, абураюцца, маўляў, на гэтым участку мае родныя ляжалі гадамі, а цяпер мы павінны плаціць за лішнюю зямлю. Здараюцца і канфліктныя сітуацыі, але іх гасяць у самым пачатку, стараюцца знайсці кампраміс. Закон ёсць закон і яго трэба выконваць. Па новых правілах адрэгулявана і вышыня агароджаў — да 40 сантыметраў. Указана таксама, што максімальная вышыня надмагільных збудаванняў не можа перавышаць 1,8 метра.

— Але ёсць альтэрнатыва традыцыйнаму пахаванню: газоннае, сцяна смутку, так званы калумбарый, — Ала Уладзіміраўна лічыць, што гэта наступны крок, паколькі месца для пахавання катастрафічна памяншаецца. Менавіта яна падняла гэтае пытанне на сесіі сельскага Савета дэпутатаў. У выніку прынята рашэнне, паводле якога распрацоўваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам варыянты размяшчэння калумбарыя і газоннага пахавання на сельскіх могілках. На гарадскіх могілках такое ўжо практыкуецца. Як гэта зрабіць у вёсцы, пакуль ніхто не ведае.

На могілках Ждановіцкага сельсавета ў любы сектар можна трапіць без праблем. Тут зроблены максімальны доступ да таго месца, дзе ідзе пахаванне. Але ж грамадзяне часам выстаўляюць агароджы амаль што на самую дарожку. Спыніць гэтую заганную практыку мусіць пастанова Міністэрства ЖКГ. Яна дала права не проста прасіць у блізкіх прыбраць агароджу з праходу, а канкрэтна прымусіць іх вярнуцца ў азначаныя нормы: двухмеснае пахаванне 2 на 2,3 метра, аднамеснае — 1,4 на 2,3 метра. Не згодны — плаціце за лішнюю плошчу.



— Ці можна па новых правілах падзахоўваць урны ў саму магілу? — пацікавілася ў Дзмітрыя Казіміравіча.

— Для гэтага трэба прадаставіць дакументы, якія пацвярджаюць сваяцтва адказных асоб за пахаванне памерлага. Гэта пасведчанні аб нараджэнні, шлюбе, галоўнае, каб супадала прозвішча і прасочваліся сваяцкія сувязі, — канстатаваў ён.

Як лічыць Дзмітрый Атрашонак, новыя правілы дапамогуць навесці парадак у пахавальнай справе, на могілках. Яны заснаваны на базе папярэдніх, але ўказаны больш канкрэтны алгарытм дзеянняў па прывядзенні тэрыторый у адпаведнасць з тымі памерамі зямельных участкаў, якія былі выдзелены першапачаткова. Дакладна прапісаны і правілы для рэзервавання ўчасткаў. На адным участку павінна быць не больш за 4 пахаванні. Адлегласць паміж радамі — як мінімум метр, праходы паміж участкамі не менш як 50 сантыметраў. «Гэта дазволіць свабодна падысці да магілы, вынесці смецце, данесці труну з целам да месца апошняга заспакаення», — адзначыў Дзмітрый Атрашонак.

*lazovskaya@zviazda.by*

СВЯТА ПОБАЧ

## Вёска Юцкі адзначыла свой юбілей

**Населены пункт быў заснаваны ў 1956 годзе. Прадпрыемства «Путчына», якое займаецца сельскагаспадарчай дзейнасцю, павіншавала сямейныя пары і маладых людзей — сваіх працаўнікоў.**

Акрамя традыцыйнага святочнага канцэрта, лепшыя домаўладальнікі атрымалі ўзнагароды ад сельскага Савета. Не забылі павіншаваць самага старэйшага і самага малодшага жыхароў вёскі. Дарэчы, Юцкі сталі апошнім населеным пунктам Дзяржынскага раёна, дзе сёлета прайшло такое свята.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

АСАБІСТАЯ АДКАЗНАСЦЬ

# ЯКІЯ МЫ ГАСПАДАРЫ?

## *Органы самакіравання сочаць за парадкам*



**Якія мы гаспадары, такія нашыя двары. Вядомую беларускую прыказку на Лоеўшчыне ўвасабляюць у жыццё не толькі напамінамі і прадпісаннямі. Правядзенне конкурсаў па добраўпарадкаванні стала тут традыцыяй, і самыя творчыя домаўладальнікі атрымліваюць заслужаныя ўзнагароды за тое, што іх хата радуе не толькі саміх, але ўсіх, хто побач праходзіць і не можа адарваць позірку ад рукатворнай прыгажосці. Дарэчы, расказвае старшыня раённага Савета дэпутатаў Аксана ЮКОЎСКАЯ, пераможцаў узнагароджваюць у святочных абставінах — звычайна ў дзень вёскі. Каб усе ведалі і прыклад бралі:**

— Штодзень усё больш грамадзян самастойна і з энтузіязмам наводзяць парадак на тэрыторыі вакол свайго дома, усталёўваюць добрыя агароджы і малыя архітэктурныя формы, рамантуюць фасады і высаджваюць кветнікі. Увогуле навядзенне парадку на зямлі — адно з самых актуальных пытанняў, якое знаходзіцца на пастаянным кантролі раённай вертыкалі. Сумесная работа мясцовых органаў улады і жыхароў дазволіла рэалізаваць шэраг ініцыятыў па добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Мы пастаянна праводзім месячнікі па навядзенні парадку. Прыводзім да ладу тэрыторыі, раскарчоўваем дрэвы, зносім трухлявыя хаты, надаём эстэтычны выгляд камунальным будынкам, рамантуем і афарбоўваем агароджы. Толькі сёлета ў раёне прыбрана 105 аварыйных дрэў, 190 стыхійных мінізвалак, усталявана і афарбавана амаль пяць кіламетраў новых агароджаў... Да таго ж Лоеўскі райжылкамгас зрабіў абследаванне грамадскіх калодзежаў. 19 з іх сёлета адрамантавана.

***— Аксана Аркадзеўна, падтрыманне парадку на могілках заўсёды застаецца справай важнай...***

— Так, іх на Лоеўшчыне 76. Два разы на год, вясной і ўвосень, на могілках рамантуюцца агароджы, вывозіцца смецце, выразаюцца хмызнякі. Сёлета практычна 3,5 тысячы гарадскіх і сельскіх жыхароў, у тым ліку члены грамадскага аб'яднання «Белая Русь», прынялі ўдзел у раённай акцыі «Памяць», прысвечанай навядзенні парадку ў месцах пахавання нашых продкаў. Важна, што работа па добраўпарадкаванні на Лоеўшчыне вядзецца сістэмна. За 2015 год і мінулы перыяд гэтага знесена 122 трухлявых дамы. У базе даных яшчэ 289, па якіх рыхтуюцца дакументы. Вызваленыя ад пабудоў землі паступова ўцягваюцца ў гаспадарчы абарот. Частка з іх, пасля вычышэння ад хмызнякоў, засяваецца. З пачатку мінулага года амаль на 130 га прыбавіліся пасяўныя плошчы сельгаспрадпрыемстваў — за кошт зносу трухлявых і пустуючых хат. Таксама, вывучыўшы досвед працы Гомельскага, Чачэрскага і Буда-Кашалёўскага раёнаў, старшыні нашых сельвыканкамаў загарэліся ідэяй уладкаваць дзіцячыя пляцоўкі ў сваіх населеных пунктах.

***— Ведаю, што вы ведзяце актыўную работу з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання.***

— Дарэчы, менавіта яны і займаюцца на месцах добраўпарадкаваннем могілак, вуліц, прыдваровых тэрыторый, а таксама работай з ветэранамі, адзінокімі грамадзянамі, складанымі сем'ямі. Яны ж ініцыююць збор добраахвотных сродкаў для рашэння пытанняў мясцовага значэння. Павышэнню выніковасці дзейнасці мясцовых Саветаў спрыяе вопыт правядзення дзён дэпутатаў. Мы выкарыстоўваем розныя формы пры правядзенні такіх мерапрыемстваў.


в. Ліпнякі.


в. Карпаўка.

Адна з іх — сумесны сход дэпутатаў, якія абраны ад канкрэтнай тэрыторыі, памочнікаў старшыняў сельскіх Саветаў і прадстаўнікоў раённых службаў, якія задзейнічаны ў рашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва. Гэта РАУС, МНС, адукацыя, ахова здароўя, гандаль, сацабарона і іншыя. Другая форма — непасрэдны ўдзел дэпутатаў у сходах грамадзян па месцы жыхарства. Ну а яшчэ мы праводзім дні дэпутата непасрэдна ў працоўных калектывах. Адной з новых формаў работы дэпутатаў з насельніцтвам можна назваць выязныя пасяджэнні камісій раённага Савета дэпутатаў. Звычайна самыя вострыя пытанні вырашаюцца пасля гутарак з жыхарамі і кіраўнікамі мясцовых прадпрыемстваў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 27 верасня 2016 года.**

алімпіец
ЗВЯЗДА выпуск № 9 (46)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь



■ Вынікі

# ВОСЕМ З ДЗЕСЯЦІ

**Параалімпійскія гульні завяршылі вялікую спартыўную падзею — чарговы алімпійскі цыкл. Галоўны герой спаборніцтваў Ігар Бокі і старшыня Параалімпійскага камітэта краіны Алег Шэпель падвялі вынікі Рыа-2016.**

Беларусь на гэтым прэстыжным турніры заваявала 10 алімпійскіх узнагарод, 8 з якіх залатыя. Такі вынік дае магчымасць гаварыць аб тым, што наша дэлегацыя справілася са сваёй задачай паспяхова і годна прадставіла краіну ў Бразіліі.

*— Мы скончылі сёлетнюю Параалімпіяду паспяхова. Планавалі заваяваць 10 узнагарод, іх і прывезлі на радзіму,* — адзначае Алег Шэпель. *— Лічу, што мы павінны абавязкова планаваць усё, і не толькі ў спорце. Калі дзяржава ўкладае грошы, яна павінна патрабаваць вынік. Гэта датычыцца ўсіх галін. Недабралі некалькі ўзнагарод у лёгкай атлетыцы і дзюдо, але там нашы спартсмены былі таксама блізкія да п'едэстала,* — падкрэсліў старшыня Параалімпійскага камітэта.

Гэтак жа ён адзначыў, што самым галоўным вынікам з'яўляецца тое, што з 21 спартсмена нашай зборнай, 19 трапілі ў фінал, гэта вельмі добры ўзровень. А ўсе спартсмены-параалімпійцы на стартах у Бразіліі паказалі свае найлепшыя вынікі, многія ўстанавілі асабістыя рэкорды. Акрамя гэтага, Алег Шэпель падзяліўся меркаваннем аб арганізацыі Параалімпіяды ў Бразіліі. Ён адзначыў, што гэта былі адны з самых слабых Гульняў, не вельмі добра была наладжана работа валанцёраў і транспартныя зносіны, але кіраўнікі беларускай дэлегацыі рабілі ўсё магчымае, каб спартсмены не адчувалі праблем.

Што датычыцца далейшых планаў, то ў беларускай параалімпійскай сям'і ідзе ратацыя і амаладжэнне складу.

*— Гэта нармальны працэс. Кожны цыкл у нас мяняецца каля 25-30% складу,* — адзначыў Алег Шэпель.

Што да Ігара Бокага — галоўнага героя, то пасля прыезду з Бразіліі на яго літаральна абрынулася лавіна ўвагі (на рахунку спартсмена — 7 алімпійскіх узнагарод Рыа). Малады чалавек прызнаецца, што гэта прыемна і толькі дзякуе за такую цікавасць да сваёй персоны.

*— У першую чаргу хацелася б сказаць дзякуй усім, хто за нас хварэў і падтрымліваў. Паверце, для кожнага параалімпійца гэта вельмі важна. Дзякуючы гэтаму мы і паказвалі добрыя вынікі. Дома перад Параалімпійскімі гульнямі нам стварылі выдатныя ўмовы, гэта датычыцца і фінансавання і месцаў для трэніровак. Усе паставіліся да нас з вялікім разуменнем і спрабавалі дапамагчы. Таму атрымалі вынік вельмі добры для нашай краіны, бо далёка не ўсе могуць пахваліцца такой колькасцю ўзнагарод, нават краіны, у якіх дэлегацыі былі ў разы большыя.*

***— З усіх узнагарод для вас ёсць асаблівы медаль?***

*— Так, «бронза» за брас. Гэты від праграмы даецца мне вельмі цяжка, таму што ёсць пэўныя праблемы з каленнымі суставамі. У Лондане на дыстанцыі брасам я быў 7-м, у Бразіліі 3-м, спадзяюся, і далей буду паляпшаць свой вынік.*

***— У чым сакрэт 11-разовага параалімпійскага чэмпіёна?***

*— Для таго каб стаць чэмпіёнам, трэба мець стопрацэнтную самааддачу і поўную ўзгодненасць сваёй працы з трэнерам. Па сутнасці менавіта настаўнік — кіраўнік, а я толькі выканаўца. Таксама неабходна выконваць спартыўны рэжым, добра адпачываць і на час адкласці ўсе справы, якія не датычацца спорту.*

Ігар Бокі падзяліўся сваімі планамі, а яны ў яго грандыёзныя. Спартсмен працягне спаборнічаць з плыўцамі асноўнай нацыянальнай зборнай Беларусі, ён ужо ўдзельнічаў у чэмпіянаце і Кубку краіны.

*— Працягну выступаць ва ўнутраных спаборніцтвах сярод здаровых спартсменаў. Бо неабходна праводзіць як мага больш стартаў з моцнымі супернікамі, каб быць у тонусе, выконваць трэніровачныя аб'ёмы, якія дапамогуць удала выступіць на параалімпійскіх стартах. Што датычыцца турніраў міжнароднага ўзроўню сярод здаровых плыўцоў, пакуль пра гэта з трэнерам не думаем* ■

Матэрыялы падрыхтавала
**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Партрэт

Марына ЛІТВІНЧУК:

# «Ён — мая апора і асабісты псіхолаг»

## Хто стаіць за перамогамі і рэкордамі чэмпіёнкі



**БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА**

Марына Літвінчук (Палтаран) нарадзілася 12 сакавіка 1988 года ў вёсцы Сотнічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Выступае за нацыянальную зборную з 2006 года. Двухразовы бронзавы прызёр летніх Алімпійскіх гульняў у выступленнях на байдарцы-чацвёрцы, шматразовая чэмпіёнка свету, Еўропы і нацыянальных першынстваў. З 2012 года замужам за беларускім спартсменам Артурам Літвінчуком, алімпійскім чэмпіёнам сярод байдарак-чацвёрак на дыстанцыі 1000 метраў.

**На працягу пяці апошніх гадоў Марына Літвінчук рэдка вяртаецца са спаборніцтваў без узнагарод. Першы буйны поспех да спартсменкі прыйшоў у 2010 годзе: тады яна з байдаркай-адзіночкай на пяцікіламетровай дыстанцыі заваявала сярэбраны медаль на чэмпіянаце свету ў Познані і бронзавы на першынстве Еўропы ў Трасоне. З тых часоў дасягненні толькі растуць — у скарбонцы дзяўчыны «бронза» Алімпійскіх гульняў у Лондане, чатыры залатыя медалі Універсіяды, медалі вышэйшай пробы сусветнага першынства і нарэшце «бронза» нядаўняй Алімпіяды ў Бразіліі. Пра тое, як даводзілася спаборнічаць у Рыа, што ў бліжэйшых планах спартсменкі і пра што яна марыць, Марына расказала карэспандэнту «Звязды».**



Так выглядае спартыўная сям'я.

### Бразільскі настрой

— З-за допінгавага скандалу, што напаткаў нашу мужчынскую каманду напярэдадні Алімпіяды ў Рыа, вядома, настрой у калектыве быў не радасны. Адчувалі вялікую адказнасць, бо ўся надзея была толькі на нас. Да таго ж напружанне было звязана з тым, што нашага трэнера не было побач. Адным словам, у Бразіліі нам прыйшлося нялёгка.

Пытанні па ходу Гульняў узнікалі і да арганізатараў. Здаецца, Алімпіяда бразільцам наогул была не патрэбна. У параўнанні з Гульнямі ў Лондане яе, можна сказаць, і не было. Умовы пражывання вымушалі жадаць толькі лепшага, жылі мы як у інтэрнаце, аб добрым абслугоўванні нумароў наогул казаць не даводзіцца, хоць мы людзі і непераборлівыя.

### Вынік

— Ужо мінуў час, усе эмоцыі ўлягліся, таму спакойна можна казаць аб уражанні, якое ў цэлым засталося ад Алімпійскіх гульняў. Ведаеце, добра, што ўзялі медаль. Нам і нашаму віду спорту, нашай камандзе ён быў проста неабходны. Я спачатку стала 4-й у адзіночцы, потым 6-й у двойцы і ад такой блізкасці да п'едэстала адказнасці з кожным днём станавілася ўсё больш. Але мы з дзяўчатамі ведалі, што трэба выйсці і проста зрабіць сваю работу. А ў што гэта выльецца — ужо іншае пытанне.



**«Бронзавая» чацвёрка Рыа: Маргарыта МАХНЕВА, Вольга ХУДЗЕНКА, Надзея ЛЯПЕШКА, Марына ЛІТВІНЧУК.**

Асобна дзякуй хачу сказаць кіраўніку нашай дзяржавы за цёплыя словы. Таксама ўсяму нашаму трэнерскаму штабу і медыцынскаму персаналу, якія дапамагалі нам і па ходу падрыхтоўкі, і перад Гульнямі справіцца з маёй траўмай пляча. Увогуле дзякуй усім, хто верыў у нас і падтрымліваў у гэты складаны алімпійскі тыдзень.

### Характар

— У кожным сезоне я выконваю вялікую работу, бо ў нас вельмі цяжкі від спорту, вельмі працаёмкі. Незалежна ад маштабу спаборніцтваў, у кожнай гонцы я аддаю ўсе свае сілы, выкладаюся на 100%, напэўна, гэта такая рыса характару. Да таго ж заўсёды імкнуся выканаць трэнерскія заданні, не хочацца, каб уся тая праца, якую мы ўкладаем разам з настаўнікамі, прайшла дарма. Я выступаю ў розных класах лодак і на розных дыстанцыях, не магу вылучыць нешта любімае з гэтага, мне ў цэлым падабаецца мой від спорту, я атрымліваю ад яго задавальненне, таму заўсёды хочацца быць лепшай усюды.

Наогул жыццё чалавека складана ўявіць без няўдач, а спорт тым больш. У мяне няма своеасаблівага адчування таго, як з імі спраўляцца, я проста ніколі не апускаю рукі і не вешаю нос. Усе ў жыцці робяць памылкі, і гэта тычыцца не толькі спартыўнай сферы. Я стараюся аналізаваць свае няўдачы, рабіць высновы з таго, што адбылося, і выпраўляць промахі.

Ці магу я захварэць на «зорную» хваробу? Людзі з боку, вядома, павінны меркаваць пра гэта. Але, як здаецца мне самой, гэта мне не пагражае. Я стараюся жыць па прынцыпе: «Будзеш прасцей ты — людзі пацягнуцца».

### Проста жыццё

— Мой муж таксама спартсмен, таму ён бывае на многіх маіх стартах. А на чэмпіянат свету летась прыехаў нават з сябрамі, падтрымка ў мяне там была вар'яцкая. Ён — мая апора, заўсёды побач, заўсёды гатовы дапамагчы ўсюды і ва ўсім, ён стымулюе мяне на новыя здзяйсненні. Мой галоўны псіхолаг, ён ніколі не дазваляе пралезці дурным думкам у маю галаву. Ніякіх праблем з нагоды аднолькавай прафесіі ў нас няма, можа быць нават наадварот, гэта дапамагае знайсці нам агульную мову, бо ён ужо ведае ўсю гэтую «кухню». У маіх найбліжэйшых планах нарадзіць дзіця, а потым хацелася б, вядома, вярнуцца ў вялікі спорт.

Вольнага часу, як і ў абсалютнай большасці спартсменаў, у мяне катастрафічна мала і становіцца ўсё менш. У свае выхадныя хочацца проста выспацца, з'ездзіць у госці да мамы, яе я бачу вельмі рэдка, вядома, хацелася б праводзіць больш часу з роднымі. Люблю спакойнае баўленне часу, напрыклад, схадзіць у лес па грыбы.

# ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ АЛІМПІЯДЫ

## Што стала з аб'ектамі, на якія былі выдаткаваны сотні тысяч долараў

**Калісьці на гэтых стадыёнах вырашаліся лёсы: хтосьці тут перамагаў і заставаўся ў вачах мільёнаў героем, а хтосьці падаў і трываў самыя крыўдныя няўдачы. Сцэны алімпійскіх збудаванняў бачылі мора слёз і горы радасці, тысячы расчараванняў і сотні перамог, але ў кожнага алімпійскага аб'екта пасля завяршэння самых маштабных спартыўных спаборніцтваў пачыналася свая, новая, гісторыя.**

### АЛІМПІЯДА-1964, ТОКІА (ЯПОНІЯ)

Арэна «Ніпон Будакан» была пабудавана для спаборніцтваў па дзюдо. Але цяпер стадыён, назва якога перакладаецца з японскай як «зала баявых мастацтваў», вядомы ва ўсім свеце не міжнароднымі спартыўнымі спаборніцтвамі, а гучнымі музычнымі шоу. Першай рок-групай, якая адыграла тут серыю канцэртаў у 1966 годзе, стала The Beatles.

З 1970-х гадоў пабачылі свет дзясяткі канцэртных альбомаў, якія запісвалі на «Будакан» The Kiss, Deep Purple, Bay City Rollers, Blur, Duran Duran, Эрык Клэптан, Фрэнк Сінатра, Боб Дылан, Озі Осбарн і іншыя выканаўцы.



### АЛІМПІЯДА-1980, ЛЭЙК-ПЛЭСІД (ЗША)

Вельмі практычнае прымяненне Алімпійскай вёсцы знайшлі амерыканцы. У 1980 годзе зімовую Алімпіяду



(ужо другі раз — першы быў у 1932-м) прымала вёска Лэйк-Плэсід у штаце Нью-Ёрк.

Алімпійскую вёску ў гарах Адзіронак будавалі зняволеныя. Да пачатку гульняў іх выселілі, але ненадоўга: увосень 1980-га, менш чым праз год пасля завяршэння спаборніцтваў, інтэрнат спартсменаў афіцыйна стаў папраўчай калоніяй.

### АЛІМПІЯДА-1980, МАСКВА (СССР)

У 1980 годзе стадыён «Лужнікі» стаў адным з найважнейшых месцаў правядзення летніх Алімпійскіх гульняў у Маскве. Менавіта адсюль пад сумную песню ляцеў у начное неба алімпійскі Мішка. У 1998 годзе стадыён быў уключаны УЕФА ў спіс пяцізоркавых еўрапейскіх футбольных стадыёнаў. У 2018 годзе «Лужнікі» прымуць фінал чэмпіянату свету па футболе.



Мінскі стадыён «Дынама», на якім у 1980-м прайшоў алімпійскі футбольны турнір, цяпер знаходзіцца ў працэсе рэканструкцыі. Яго здача плануецца на 2017 год, стадыён павінен стаць шматфункцыянальнай арэнай.



### АЛІМПІЯДА-1984, САРАЕВА (ЮГАСЛАВІЯ)

Калі сам горад за два дзесяцігоддзі змог адысці ад ваенных дзеянняў, то алімпійскія аб'екты, якія раней былі ўпрыгажэннем Сараева, цяпер больш нагадваюць руіны. Напрыклад, так зараз выглядае бабслейная траса, якая прымала спартсменаў 32 гады таму.





А на месцы Алімпійскай вёскі цяпер раскінуліся могілкі.

### АЛІМПІЯДА-2004, АФІНЫ (ГРЭЦЫЯ)

Крызіс, які накрыў Грэцыю, і безгаспадарчасць мясцічаў адбіліся на алімпійскіх будынках. Гэта басейн, які застаўся пасля летніх Алімпійскіх гульняў, што прайшлі ўсяго 12 гадоў таму.




## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № Изолированное помещение – помещение общественного питания, инвентарный номер 240/D-38523, стоимостью 137 600 долларов США** |
| **Собственник (владелец) имущества** | ЗАО «Слайд» |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | ул. Советская, 2В-2, г. Орша |
| **Наличие обременений** | Право залога |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 07.10.2016 в 10.00<br>г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 12 |
| **Справочная информация об организации торгов** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши<br>211391, г. Орша, ул. Островского, 36<br>Судебный исполнитель Рожанская Кристина Викторовна, тел.: (80216) 54-32-12, 399-60-53,<br>начальник отдела Павлюченкова Наталья Евгеньевна, тел. (80216) 54-32-13 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лица, желающие принять участие в торгах, до начала торгов обязаны:<br>1. Подать заявку для участия в торгах **до 06.10.2016 до 15.00.**<br>2. Внести на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 300002505 в размере 10% от стоимости продаваемого имущества.<br>3. Дать подписку об отсутствии препятствий, предусмотренных законодательными актами Республики Беларусь, для приобретения имущества.<br>4. Величина первого шага составляет не менее 5% от начальной стоимости выставленного на торги лота. |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О СНЯТИИ ОБЪЕКТА С ТОРГОВ

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)
сообщает о снятии с аукциона по продаже земельных участков
в частную собственность, назначенного на **14.10.2016, лота № 9**
(земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома площадью 0,1500 га, кадастровый номер земельного участка 623683403101007823, расположенный по адресу: Колодищанский с/с, аг. Колодищи, квартал 7139, участок № 11).
Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.09.2016 г.

УНН 690324015

УНП 200295587

**Открытое акционерное общество «Брестская трикотажная фирма «Элма»**
**УВЕДОМЛЯЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРАВЕ ТРЕБОВАНИЯ ВЫКУПА АКЦИЙ ОБЩЕСТВА**

| | |
|---|---|
| **Полное наименование и место нахождения** | Открытое акционерное общество «Брестская трикотажная фирма «Элма» г. Брест, ул. Куйбышева, 13 |
| **Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются** | Открытое акционерное общество «Брестская трикотажная фирма «Элма» г. Брест, ул. Куйбышева, 13 |
| **Цель приобретения акций** | Сокращение общего количества акций (аннулирование) и уменьшение уставного фонда общества |
| **Количество приобретаемых акций по требованию акционеров** | 24 369 (Двадцать четыре тысячи триста шестьдесят девять) штук. В случае если общее количество акций, предложенных для выкупа по требованию акционеров, превышает количество акций, которое может быть приобретено акционерным обществом с учетом указанного выше ограничения, акции выкупаются у акционеров пропорционально заявленным требованиям.<br>Приобретение акций обществом по требованию акционеров не осуществляется в случаях установления законодательством соответствующих запретов (ограничений) |
| **Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции** | 0,30 (Тридцать копеек) белорусских рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами |
| **Срок, форма и порядок оплаты акций** | Путем перечисления денежных средств на счет продавца в течение 30 календарных дней после истечения срока предъявления акционерами письменных требований о выкупе акций |
| **Адрес, по которому будут приниматься заявления с требованием выкупа акций и заключаться договоры купли-продажи акций** | г. Брест, ул. Куйбышева, 13 |
| **Срок, в течение которого акционеры могут предоставить заявление с требованием выкупа акций** | с 28.09.2016 г. по 28.10.2016 г. |
| **Срок, в течение которого осуществляется приобретение акций** | с 29.10.2016 г. по 29.11.2016 г. |
| **Контактный телефон** | 8 (0162) 21 16 19 |

## РУП «Белтелеком» (Могилевский филиал)

**извещает о проведении аукциона по продаже объектов, находящихся в собственности Республики Беларусь, и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества**

**Аукцион состоится 13 октября 2016 г. в 11.10**
**по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**

**Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», продавец имущества: республиканское унитарное предприятие электросвязи «БЕЛТЕЛЕКОМ»**

**Сведения о предмете аукциона** – капитальные строения: одноэтажное кирпичное здание конторы материально-технического снабжения с тамбуром, пристройкой общей площадью 200,7 кв.м, двумя дощатыми уборными, тремя ограждениями (железобетонные плиты на бетонных столбах, кирпичное на бетонных столбах и дощатое решетчатое на бетонных столбах), двумя воротами и двумя калитками (металлическая решетка на металлических столбах), двумя железобетонными подземными резервуарами по 5 куб.м, тремя покрытиями (асфальтобетонное 3 061 кв.м, бетонное 84 кв.м и бетонные плиты 167 кв.м), блочно-кирпичной эстакадой открытого типа, рампой (кирпич и сетка) 193 кв.м; одноэтажное каменное здание склада 78,8 кв.м; одноэтажное кирпичное здание склада 299,2 кв.м; одноэтажная каменная пристройка к складу 33,1 кв.м, расположенные по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 178А, а также кабельная линия КЛ 0,4 (инв. № 4730001), трансформатор ТМ-6310 к КТП 394 (инв. № 4742005), и право заключения сроком на 26 лет договора аренды земельного участка площадью 1,4581 га для обслуживания недвижимого имущества.

**Начальная цена предмета аукциона:** 247 613 рублей 1 копейка (до деноминации 2 476 130 100 рублей), в том числе:

**имущества** 110 612 рублей 26 копеек (до деноминации 1 106 122 600 рублей);

**права заключения договора аренды земельного участка** 137 000 рублей 75 копеек (до деноминации 1 370 007 500 рублей).

Предполагаемое к продаже имущество расположено на окраине города Могилева, имеет хорошие подъездные пути.

Справочную информацию по вовлечению в хозяйственный оборот недвижимого имущества можно получить в Могилевском филиале РУП «Белтелеком» по телефонам: 8-0222 29-21-33, 8-0222 29-21-34, и Фонде «Могилевоблимущество» по телефонам: 8-0222 22-90-22, 8-0222 22-33-75.

**Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!**

## Фондом «Гроднооблимущество»

**производится аукцион со снижением начальной цены продажи на 80 процентов по продаже:**

- ЗДАНИЯ НЕЖИЛОГО С ПРИНАДЛЕЖНОСТЯМИ, расположенного по адресу: город Волковыск, улица Осипенко, 6.
- ЗДАНИЯ АВТОПАВИЛЬОНА «ВОЛПА» С ПРИНАДЛЕЖНОСТЯМИ, расположенного по адресу: Волковысский район, Волповский сельсовет, агрогородок Волпа, улица Мостовская, 32.
- ЗДАНИЯ СЕЛЬСКОГО КЛУБА С ПРИНАДЛЕЖНОСТЯМИ, расположенного по адресу: Волковысский район, Гнезновский сельсовет, деревня Мстибово, улица Волковысская, 2А.
- ЗДАНИЯ СЕЛЬСКОГО КЛУБА, расположенного по адресу: Волковысский район, Гнезновский сельсовет, деревня Шустики, 7А.
- ЗДАНИЯ СЕЛЬСКОГО КЛУБА, расположенного по адресу: Волковысский район, Изабелинский сельсовет, деревня Богди, 49.

**Аукцион состоится 6 октября 2016 г. в 11.30.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: город Гродно, улица 17 Сентября, 39.**
**Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – 30 сентября 2016 г. до 13.00.**

Подробная информация по телефонам:
**в городе Волковыске – 4-50-25; в городе Гродно – (80152) 772915, 722518,**
на официальном Интернет-сайте Волковысского районного исполнительного комитета
**http://volkovysk.grodno-region.by/ru/news/izv.**

УНН 500586760

Сельскохозяйственный производственный кооператив «Олекшицы» Берестовицкого района Гродненской области
РЕОРГАНИЗУЕТСЯ
путем преобразования в районное унитарное сельскохозяйственное предприятие «Олекшицы».

УНП 500014464

■ Родныя тапонімы

# Край «птушыных» прозвішчаў і вуліц... касманаўтаў,

ці Чаму ў Рагачове варта ўвекавечыць імёны Андрэя Макаёнка і Міхася Лынькова?

**Свята беларускага пісьменства ў Рагачове ўжо прайшло, аднак пакінула пасля сябе не толькі прыемныя ўражанні, але і абноўленую інфраструктуру горада, цікавыя рэалізаваныя творчыя праекты. Адным са знакавых мерапрыемстваў стала канферэнцыя «Рагачоўскія чытанні», арганізаваная Інстытутам мовазнаўства НАН Беларусі. Там не толькі гучалі адметныя даклады, але і на падставе найбольш слушных выступленняў прынята рэзалюцыя з прапановамі на будучае. Напрыклад, надаць вуліцам Рагачова імя Андрэя Макаёнка і Міхася Лынькова. Пра тое, чым найбольш зацікавіла Рагачоўшчына, карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з дырэктарам Інстытута мовазнаўства Ігарам КАПЫЛОВЫМ.**


Фота Надзеі БУЖАН.

***— Ігар Лявонавіч, на канферэнцыі вы чыталі даклад пра прозвішчы рагачоўцаў. Ці заўважылі нейкія агульныя тэндэнцыі?***

— У мінулым годзе я рабіў аналагічны даклад па прозвішчах шчучынцаў і ўбачыў істотную розніцу. Сістэма прозвішчаў на захадзе і ўсходзе кардынальна адрозніваецца. У апошніх бачны яскравы ўплыў рускай антрапанімічнай сістэмы. Суфіксы «-оў», «-еў», «-ін», «-ын», якія часта сустракаюцца (каля 70%), больш характэрны для рускай тэрыторыі. Для Беларусі больш тыповыя суфіксы на «-іч», а таксама з «чыстай» асновай — Заяц, Шпак, Воўк — на Рагачоўшчыне такіх прозвішчаў зусім нямнога. 12% заканчваюцца на «-енка», «-энка» — гэта ўкраінскі ўплыў, і 12% на «-скі» — уплыў польскай антрапанімічнай сістэмы. Такім чынам, у прозвішчах адлюстравалася ўся гісторыя Рагачоўшчыны, пачынаючы з 1142 года (першага летапіснага ўпамінання горада). На фарміраванне сістэмы прозвішчаў паўплывалі такія фактары, як гандлёвыя стасункі (па Дняпры праходзіў шлях з варагаў у грэкі), пастаянныя вайсковыя сутычкі (горад заўсёды быў у цэнтры канфліктаў паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, гарады Рагачоў і Лучын былі разрабаваны і спалены крымскімі татарамі). Не прайшоў бясследна і перыяд знаходжання ў складзе Рэчы Паспалітай, калі было ўтворана Рагачоўскае староства Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства Рэчы Паспалітай. А яшчэ Рагачоўшчыну можна назваць краем птушыных прозвішчаў: *Вараб'ёў, Воран, Голуб, Драчоў, Драздоў, Дзятлаў, Жураўлёў, Зуй (так называлі невялікіх кулікоў), Кніга (укр. «чайка»), Казадоеў, Коршак, Коршыкаў, Коршунаў, Крумкачоў, Кулік, Курапаткін, Курачкін, Лебедзеў, Пліска, Пугачоў, Сарока, Сініцын, Снегіроў, Сакалоў, Удодаў, Уткін, Цаплін, Чыркоў, Чыжоў, Шпакаў...* Выклікае вялікую цікавасць надзвычайная разнастайнасць варыянтаў аднакаранёвых прозвішчаў: *Заяц, Зайцаў, Зайчыкаў; Гусакоў, Гусач, Гусёнак, Гусікаў, Гуськоў; Горбач, Гарбаценка, Гарбаценкаў, Гарбачоў, Гарбачэўскі, Гарбалёў, Горбаў, Гарбуноў; Лобан, Лабанаў, Лабанок, Лобікаў* і інш.

***— Ці даследавалі назвы вуліц Рагачова?***

— Вельмі адметным атрымаўся даклад Ганны Мезенкі з Віцебска, якая акурат праанalізавала назвы вуліц Рагачова, звязаныя з імёнамі людзей. Высветлілася, што ў гонар удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны названы 24 вуліцы. У гонар касманаўтаў — 16 вуліц (можна падумаць, што гэта горад касманаўтаў, ні адно іншае паселішча Беларусі не мае столькі вуліц гэтай тэматыкі!). У гонар пісьменнікаў — 16 вуліц. Але з іх толькі 3 названы ў гонар беларускіх творцаў — Янкі Купалы, Якуба Коласа і Уладзіміра Караткевіча. У гонар камуністычных дзеячаў — 8 вуліц. Пры гэтым з беларускіх партыйных дзеячаў толькі 1 — Васіль Казлоў. У гонар дзеячаў рэвалюцыі — 6 вуліц. Столькі ж і ў гонар міжнародных дзеячаў рэвалюцыйнага руху. Такая статыстыка падштурхнула нас напрыканцы канферэнцыі звярнуцца да кіраўніцтва раёна з прапановай перагледзець сістэму назваў вуліц і ўнесці пэўныя змены. Мы раім усё-такі ўвекавечыць памяць ураджэнца Рагачоўскага раёна народнага пісьменніка Беларусі Андрэя Макаёнка (да гэтага часу няма такой вуліцы). І ўшанаваць памяць другога народнага пісьменніка Міхася Лынькова, які на гэтай зямлі атрымліваў пачатковую адукацыю, тут фарміраваўся яго талент.

***— Вуліца Караткевіча ў Рагачове ёсць, але зусім невялікага памеру...***

— Так, вуліца з'явілася ў 2010 годзе, але яна досыць дзіўная — падзеленая гімназіяй на дзве часткі. На гэтай вуліцы стаіць дом сваякоў пісьменніка, пабудаваны яшчэ ў 1912 годзе. Дом знешне і знутры даволі цікавы ў архітэктурным плане. У ім часта бываў сам Караткевіч, працаваў там. Тут і сёння захавалася канапа, на якой спаў пісьменнік, яго зэдлік і стол. Дом патрабуе вялікага рамонту. Цяпер у ім жывуць сваякі класіка, але яны згодны перасяліцца ў звычайную кватэру і перадаць дом пад музей. Таму яшчэ адна прапанова, з якой звяртаюцца ўдзельнікі канферэнцыі, — ператварыць гэты дом у музей. Нават улічваючы сённяшняе эканамічнае становішча, патрабаванні часу, гэты дом стане вельмі прывабным турыстычным аб'ектам. Яго адкрыццё пасадзейнічае развіццю горада, турызму, папулярызацыі нашай гісторыка-культурнай спадчыны.


Дом, дзе бываў Караткевіч, стаіць у Рагачове на вуліцы Караткевіча.

***— Захаваліся таксама дамы народнага пісьменніка Андрэя Макаёнка ў Борхаве і Журавічах...***

— Мы пабывалі ў журавіцкім школьным музеі Андрэя Макаёнка, там захоўваюцца цікавыя рукапісы і экспанаты. Але ж трэба зберагчы і дом, у якім нарадзіўся пісьменнік, у Борхаве. Гэты будынак яшчэ можна захаваць, хоць пэўныя меры трэба прымаць неадкладна. Бо людзі, якія жылі там апошнім часам, ужо пачалі разбіраць дах... Гэта радзіма народнага пісьменніка, драматурга, які ў мінулым стагоддзі славіўся ва ўсім Савецкім Саюзе. Таму гонар землякоў і ўсёй беларускай нацыі — захаваць дом і зрабіць у ім музей. Ён стане яшчэ адным гісторыка-культурным аб'ектам, прывабным і для школьнікаў, і для творчай інтэлігенцыі, і для турыстаў.

***— Дом у Журавічах, дзе пазней жыла сям'я Макаёнка, зусім цэлы!***

— Так, але гэта ўжо іншы перыяд яго жыцця. А ў Борхаве менавіта тое месца, дзе ён з'явіўся на свет... Няхай у такім разе будуць два дамы пісьменніка, узаемазвязаныя паміж сабой.

***— За справу стварэння дома-музея звычайна бяруцца не вельмі ахвотна, спасылаючыся на тое, што няма экспанатаў і чым запоўніць памяшканне...***

— Часам знаходзяцца экспанаты нават 100- і 200-гадовай даўніны. А Андрэй Макаёнак — амаль што наш сучаснік. Таму пошук яго рэчаў — невялікая праблема. Напрыклад, і сёння знаходзяцца прадметы для краязнаўчага музея Караткевіча. Пры нас гаспадыня таго дома перадала некалькі кніг з яго аўтографамі, а таксама кнігу, падпісаную яму Рыгорам Барадуліным. Гэтыя каштоўныя рэчы мы знайшлі амаль выпадкова і адразу перадалі ў мясцовы музей. Тым больш усё проста са спадчынай Макаёнка — яшчэ жывыя яго сын, дачка, малодшы брат, сябры-пісьменнікі — наўрад ці яны не захоўваюць хоць нешта з яго спадчыны (тым больш у Мінску няма музея Макаёнка). Можна адлюстраваць побыт сям'і таго часу, у які нарадзіўся пісьменнік. Калі творча падысці, гэту справу атрымаецца зрабіць якасна, і яна будзе цікавая ўсім, а найперш — школьнікам.

***— Ці можна разлічваць, што дамы-музеі прывабяць турыстаў?***

— Несумненна, ахвочыя завітаць у іх заўсёды знойдуцца. А найперш наведвальнікамі павінны быць дзеці — трэба працаваць з вучнёўскай моладдзю, папулярызаваць нашу спадчыну. Пэўна, лепш адзін раз наведаць такі дом, чым шмат разоў завочна чуць на ўроках пра пісьменніка. Мне здаецца, цікавасць да такіх аб'ектаў сёння павялічваецца. Але, натуральна ж, трэба праводзіць работу па іх папулярызацыі.

***— Напрыклад, ладзіць «літаратурныя вандроўкі»?***

— Так, бо гэта справа ў нас пакуль у пачатковым стане. Амаль няма такога, каб, толькі выехаўшы з Мінска, экскурсавод пачынаў расказваць пра літаратараў... Сёння тэхнічныя сродкі дазваляюць нават віртуальна праводзіць экскурсіі па мясцінах літаратараў — паказваць іх сталічным вучням ці жыхарам іншых куткоў краіны.

***— Магчыма, саму канцэпцыю Дня пісьменства ў будучым варта дапоўніць адкрыццём дамоў-музеяў пісьменнікаў той зямлі, якая прымае свята, рэстаўрацыяй пэўных аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны?..***

— Добра, што праводзіцца гэта свята, яно цікавае людзям. Я ўбачыў, як Рагачоў сапраўды ажыў, загучала беларускае слова. Гараджане задумаліся пра сваю спадчыну, пабывалі на нашай канферэнцыі і зразумелі, наколькі яны багатыя! Адкрыліся ці абнавіліся многія сацыякультурныя аб'екты — усё гэта застанецца гараджанам. Але хацелася, каб і назвы вуліц мяняліся. Мы жывём у незалежнай краіне — перыяд гісторыі, які папярэднічаў ёй, ужо прайшоў. Трэба паварочвацца да нацыянальнай спадчыны, адкрываць музеі, аднаўляць спадчыну. Гэта патрэбна для будучыні. Бо без мінулага яе быць не можа.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*
*Рагачоўскі раён*

**Археолаг Мікола Крывальцэвіч прапануе стварыць рагачоўскі археалагічны запаведнік. Ужо праведзена скрупулёзнае вывучэнне навакольных тэрыторый і знойдзена шмат археалагічных знаходак, асабліва на тэрыторыі ад Вішчына да Лучына. Гэта старажытныя курганныя могільнікі — яшчэ з III тыс. да н.э., якія прызнаны помнікамі еўрапейскага значэння. На Вішчынскім гарадзішчы знойдзены адзін са знакамітых скарбаў XII стагоддзя, які таксама мае значнасць для ўсёй Еўропы.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЯК І КАЛІ ЗБІРАЦЬ АБЛЯПІХУ?



**Правільна вызначыць тэрміны збору абляпіхі важна для таго, каб не толькі палегчыць гэтую нялёгкую працу, але і максімальна захаваць карысныя рэчывы, уласцівыя гэтай гаючай ягадзе.**

Ураджай пачынаюць збіраць тады, калі афарбоўка ягад найбольш інтэнсіўная і характэрная для канкрэтнага сорту. Спелыя плады тугія, лёгка адрываюцца. У гэты час у іх самае высокае ўтрыманне вітаміну С. Тэрміны збору ўраджаю залежаць ад сорту. Важна таксама памятаць, што час, калі варта збіраць абляпіху, залежыць ад будучага скарыстання. Калі вы хочаце ўжываць ягаду ў свежым выглядзе або зварыць з яе варэнне ці кампот, то варта збіраць абляпіху ў самым пачатку яе батанічнай сталасці. У гэты перыяд ягада найбольш поўная аскарбінавай кіслатой, яшчэ досыць цвёрдая і не дае сок. Калі ж вы хочаце прыгатаваць абляпіхавы алей, то варта пачакаць пару тыдняў, пакуль ягада напоўніцца сокам і стане мякчэйшай. Частка ягад пры гэтым можа размякчыцца, утрыманне вітаміну С некалькі паменшыцца, але затое будзе большы выхад алею.

Раннія сарты пачынаюць збіраць ужо ў першай дэкадзе жніўня, хоць некаторыя сарты свае лепшыя смакавыя і вітамінныя якасці праяўляюць толькі ў канцы жніўня.

Да збору позніх сартоў прыступаюць толькі ў другой палове верасня. Зрэшты, дакладныя тэрміны шмат у чым залежаць ад умоў надвор'я.



## СПОСАБЫ ЗБОРУ ЎРАДЖАЮ

Для тых, хто сутыкнуўся са зборам абляпіхі ўпершыню, гэтая задача можа здацца няпростай у параўнанні з іншымі ягадамі. Кароткая пладаножка, калючкі на галінках — усё гэта можа стаць сур'ёзнай перашкодай. Па-першае, калючкі досыць балюча колюцца, а пладаножка моцна звязаная з далікатнай скуркай, так што мяккія ягады лёгка камячацца ў руках, вылучаючы пры гэтым сок, які шчыпле скуру і можа пакінуць на ёй раздражненне. Да таго ж ягады растуць на галінках у такой вялізнай колькасці, што збор кожнай ягады асобна можа ператварыцца ў шматдзённую працу. Але не варта адчайвацца! Умелыя садаводы ўжо даўно прыдумалі адразу некалькі спосабаў бяспечнага і хуткага збору абляпіхі.

Традыцыйны спосаб — збор рукамі і маленькімі нажніцамі дрэнны тым, што займае вельмі шмат часу. Але ў яго ёсць сур'ёзная перавага — калі вы будзеце дастаткова ўважлівыя, то не пашкодзіце ні ягаду, ні дрэва. Да таго ж, у адрозненні ад выкарыстання розных прыстасаванняў для збору абляпіхі, збор рукамі, пры належнай цярплівасці, дае найбольшы ўраджай. Лепш здымаць ягады ў напрамку ад нізу галінкі да яе вяршыні, каб пазбегнуць балючых уколаў.

Калі да моманту паспявання абляпіхі раніцай ударыць прымаразак, то можна сабраць ураджай наступным чынам. Разаслаць пад дрэвам шчыльнае палатно, канец палкі абматаць анучай і ўдараць ёй па галінках: марожаныя ягады будуць лёгка абсыпацца.

Папулярны і такі спосаб збору абляпіхі. На кустах і дрэвах зразаюць сляпыя галінкі, гэта значыць тыя, якія не маюць працягу прыросту і шчыльна абсыпаныя ягадамі. Гэтыя галінкі заносяць у памяшканне і, не спяшаючыся, у камфортных умовах збіраюць ураджай. Як правіла, галінак, прыдатных для зрэзкі, на дрэве налічваецца прыкладна палова. Лісточкі і маладыя галінкі не варта выкідваць, лепш іх засушыць і выкарыстоўваць зімой для прыгатавання вітаміннай гарбаты.

Якія галіны зразаюць? У абляпіхі штогод утвараюцца так званыя сляпыя пачаткі. Гэта галіны ўнутры кроны ў цэнтральнай і ніжняй частцы дрэва. Гэта пладаносныя, але слабыя парасткі, на якіх новыя парасткі не ўтворацца. Вось такія галіны і зразаюць пры зборы ўраджаю. Таксама без шкоды для дрэва можна зрэзаць і галіны, якія ўтвараюць невялікі прырост, калі сумарная даўжыня новых парасткаў не перавышае даўжыні галіны, на якой яны ўтварыліся.

Зрэзаныя галіны можна абабраць, а можна пакласці іх на захоўванне ў халадзільнік. Яны могуць захоўвацца даволі доўга, а ў замарожаным выглядзе нават даляжаць да новага ўраджаю.

Існуе цэлае мноства розных прыстасаванняў для збору абляпіхі. Усе яны закліканы аблегчыць працэс збору ягады і, галоўнае, зрабіць яго больш хуткім.

Найменш траўматычнае для дрэва прыстасаванне — расцяжка з лёскай. Яна вырабляецца з пінцэта, дроту або іншага спружыністага матэрыялу. Аснова расцяжкі павінна мець форму рагаткі, да яе канцоў прывязваецца лёска дыяметрам 0,2-0,3 мм. Гэтай лёскай і здымаюць ягады, мякка падразаючы пладаножкі. Пры гэтым кара дрэва практычна не пакутуе, і не расціскаюцца ягады.

Выкарыстоўваючы прыстасаванні для збору абляпіхі, трэба разаслаць пад дрэвам плёнку, на якую ягады будуць сыпацца, або падвесіць да галін «дагары нагамі» адкрыты парасон.

Часта выкарыстоўваецца так званая кобра. Гэта сагнуты ў выглядзе завесы тонкі дрот, які прымацаваны да драўлянай ручкі. Кончык завесы трохі прыціскаюць пальцамі (ён будзе нагадваць падпаленую свечку). З дапамогай такога прыстасавання проста зразаць пладаножкі і збіраць ягады. Гэтае прыстасаванне дапаможа здабыць ягады, размешчаныя ў самых недаступных месцах.

Калі вам не хочацца займацца вырабам розных прыстасаванняў ці вам неабходныя зусім не ягады, а сок абляпіхі, то варта звярнуцца да наступнага метаду. Абавязкова надзеньце чыстыя кулінарныя пальчаткі, бо сок абляпіхі можа пашкодзіць скуру рук! Пад галінку з ягадамі неабходна падставіць ёмістасць для соку; чыстай рукой павольна праводзім ад верху галінкі ўніз, здушваючы ягады такім чынам, каб з іх выцякаў сок. Вось і ўсё! За гадзіну такой работы можна сабраць 3-4 літры абляпіхавага соку.

Часта камбінуюць розныя спосабы ўборкі ўраджаю. Частку галін, размешчаных усярэдзіне кроны, зразаюць, з пакінутых галін ягады збіраюць з выкарыстаннем спецыяльных прыстасаванняў, там дзе прыстасаванні выкарыстоўваць немагчыма, плады збіраюць уручную.

## ДОГЛЯД

Скончыўшы збор ураджаю абляпіхі, абавязкова паклапаціцеся пра расліны: вельмі асцярожна прарыхліце пад дрэвамі глебу на глыбіню не больш за 5 см, добра паліце і замульчыруйце.

Пры абрэзцы буйныя раны на ствале і галінках абавязкова зачысціце і замажце садовым варам.

Для паскарэння пладанашэння маладыя дрэўцы абляпіхі фарміруюць. Вясной леташнія парасткі адхіляюць гарызантальна і фіксуюць у такім становішчы, напрыклад, пры дапамозе калкоў і вяровачак. Да жніўня фарміраванне парасткаў заканчваецца, і прыстасаванні, якія фіксуюць, прыбіраюць. На сфарміраваных такім чынам галінах утвараецца шмат кароткіх парасткаў, якія даюць «пачаткі» з ягадамі.



Даты | Падзеі | Людзі

**28 ВЕРАСНЯ**

**1618** год — у Брусэлі адкрыты першы ў свеце ламбард.

**1916** год — нарадзілася Вольга Васільеўна Лепяшынская, легендарная руская балерына.



**1941** год — нарадзіўся (вёска Чырвоная Зорка Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобласці) Віктар Уладзіміравіч Кончыц, беларускі вучоны ў галіне рыбаводства, доктар сельскагаспадарчых навук.

**1953** год — Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў абраны Першым сакратаром ЦК КПСС.

**1971** год — у Савецкім Саюзе запушчана аўтаматычная міжпланетная станцыя «Месяц-19», якая вымерала магнітнае поле Месяца. На Зямлю перададзены фатаграфіі месяцовай паверхні.




**1972** год — падчас тэлетрансляцыі хакейнага матча СССР—Канада каментатар Мікалай Озераў вымавіў сваю знакамітую фразу: «Такі хакей нам не патрэбны!» (Канадцы закінулі пераможную шайбу за 34 секунды да канца гульні, выйграўшы серыю гульняў 6:5.)

**2001** год — Савет Бяспекі ААН прыняў рэзалюцыю 1373 «Пагрозы міжнароднаму міру і бяспецы, ствараемыя актамі тэрарызму», якая прадугледжвае меры па фарміраванні глабальнай сістэмы процідзеяння тэрарызму і стварэнне спецыяльнага Контртэрарыстычнага камітэта Савета Бяспекі ААН.

**2008** год — у Беларусі адбыліся выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

Было сказана

**Сяргей ГРАХОЎСКІ, паэт:**
*«Спынішся — плынню адгоніць назад».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 7.06 | 18.53 | 11.47 |
| Віцебск | — 6.56 | 18.42 | 11.46 |
| Магілёў | — 6.56 | 18.43 | 11.47 |
| Гомель | — 6.53 | 18.40 | 11.47 |
| Гродна | — 7.22 | 19.08 | 11.46 |
| Брэст | — 7.22 | 19.09 | 11.47 |

### Месяц

***Апошняя квадра 23.09—30.09. Месяц у сузор'і Дзевы.***

### Імяніны

***Пр.** Людмілы, Марыі, Дзмітрыя, Івана, Максіма, Мікалая, Мікіты. **К.** Вацлава, Лаўрэнція, Марка, Сымона.*


Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Ты давяраеш сваёй дзяўчыне?

— Як можна верыць чалавеку, які пад фатаграфіяй сваёй страшнай сяброўкі піша «Прыгажунька»?

**У ложку яна была сапраўдная тыгрыца.**

**...Рудая і вагой пад 150 кілаграмаў.**

Бацька з сынам.

— Ну, сынок, пакажы дзённік. Што ты сёння прынёс са школы?

— Ды няма чаго паказваць, там усяго адна двойка.

— Усяго адна?

— Не хвалюйся, тата, я заўтра яшчэ прынясу!

**Дэвіз дзяцей:**

**— Калі мама сказала «Не!», спытай у бабулі!**



Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3868.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 27 верасня 2016 года.